ГЕНАЦЫД БЕЛАРУСАЎ У ЧАСЫ ВАЙНЫ 4

У ТРЭНДЗЕ ЭКАСКУРА, ЛЁН, КЛЁШ І МАНАХРОМ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ЛІПЕНЯ 2021 г. СУБОТА № 130 (29499)

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:

«Ёсць бок, які вырабляе, вырошчвае прадукцыю. І ёсць другі бок, які пры неадрэгуляванасці выкарыстоўвае магчымасць на кімсьці зарабіць. У гэтай сітуацыі важна выпрацаваць падыходы ў пытаннях цэнаўтварэння і аб'ектыўнага размеркавання прыбытку паміж усімі ўдзельнікамі вытворчага ланцужка — ад сельгасвытворцаў да гандлю. Важна, каб былі выразныя, зразумелыя правілы, празрыстыя і аб'ектыўныя механізмы. У краіне вырошчваецца дастатковая колькасць прадукцыі, здольная ў поўнай меры забяспечыць унутраны рынак. Прадукцыя, якая ідзе для нашых людзей, павінна быць у магазінах па адэкватных цэнах».

КАРАТКА

- **У Беларусі спрашчаецца парадак выканання знешнегандлёвых дагавораў.**
- На Гульнях у Токіа выступяць 109 беларускіх спартсменаў у 20 відах спорту.
- **У медустановы з 21 чэрвеня звярнуўся 191 чалавек з цеплавым ударам.**
- За суткі ў Беларусі зарэгістраваныя 1250 пацыентаў з COVID-19, выпісаныя 1335.
- **Панды ў Кітаі больш не знаходзяцца пад пагрозай знікнення.**
- Музей праса стварылі на цокальным паверсе Касаўскага палаца.
- **У Беларусі за суткі ў лясах згубіліся 5 чалавек.**
- Інфляцыя ў Беларусі ў чэрвені склала 0,7 %.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У нашай радавой памяці закладзена ўменне пераадольваць цяжкасці і перамагаць»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстых провадах беларускай спартыўнай дэлегацыі на XXXII летнія Алімпійскія гульні

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Алімпіяду ў Токіа, да якой засталіся лічаныя дні, доўга чакалі і спартсмены, і аматары. «Абсалютна перакананы, што адкладзены старт спаборніцтваў, назапашаная энергія, падзеі ў краіне і свеце зробяць будучую барацьбу за медалі як ніколі жорсткай і бескампраміснай. Гэта барацьба заўсёды была цяжкай, але гэтым разам яна будзе яшчэ цяжэйшай», — сказаў ён.

Фота БелТА.

Прэзідэнт папярэдзіў спартсменаў, што іх спартыўныя дасягненні — гэта не толькі асабісты трыумф. Сёння яны падобны палітычным перамогам. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, спорт даўно стаў разменнай картай у палітыцы. «Шчыра скажу, вашы поспехі павінны стаць адказам здраднікам, якія спачатку ўзялі ад краіны ўсё, што можна, а цяпер жадаюць ёй паражэння. Адказам тым дзяржавам, якія душаць Беларусь санкцыямі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар заўважыў, што гэта найвышэйшая адказнасць, і спартсмены гэта разумеюць. Але, па яго словах, гэтая ноша не цяжэйшая за тыя выпрабаванні, якія атлеты ўжо пераадолелі.

СТАР. 2

Фота БелТА.

«Атланты» пачынаюцца тут

Байцы студэнцкіх атрадаў працуюць на вытворчым прадпрыемстве «Атлант». Усяго на завод прыйшлі 450 хлопцаў і дзяўчат, ім даручана тэхналагічна нескладаная работа, якую яны выконваюць пад кіраўніцтвам майстра вытворчасці.

Прыкметы часу

«СТАЛІ ЧАСЦЕЙ БЕЗ МАСАК ХАДЗІЦЬ...»

Прагуляліся па летнім Мінску і высветлілі, ці многія носяць маскі ў спякоту

Навіны пра COVID-19 — звычайны фон сучаснага жыцця — ужо не выклікаюць былога ажыятажу. Між тым у канцы чэрвеня ў Мінску выяўлены індыйскі штам каранавіруса, а ў суседняй Расіі 6 ліпеня зафіксаваны максімальны сутачны прырост памерлых ад кавіду з пачатку пандэміі. Мы пагутарылі з жыхарамі сталіцы і даведаліся, ці носяць яны маскі і ўвогуле ці імкнуцца абараніць сябе ад вірусаў.

Апошні год быў настолькі багаты на падзеі, што, напэўна, не лішнім будзе нагадаць у агульных рысах, як пачалася гісторыя ўзаемаадносін чалавецтва з вірусам COVID-19. Упершыню ўспышка захворвання новым вірусам была зафіксавана ў снежні 2019 года (ва Ухані, Кітай). 30 студзеня мінулага года Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла гэтую ўспышку надзвычайнай сітуацыяй у галіне грамадскай аховы здароўя, якая мае міжнароднае значэнне, а 11 сакавіка — пандэміяй. Але і пасля паўтара года ковід па-ранейшаму адна з галоўных тэм ва ўсім свеце. І Беларусь не выключэнне. Так, у канцы чэрвеня прэс-служба Міністэрства аховы здароўя паведаміла, што ў Беларусі выяўлены індыйскі штам каранавіруса. Медыкі кажуць аб новых сімптомах: моцных галаўных болях і болі ў горле, насмарку, млоснасці і дыярэі, а таксама аб тым, што індыйскі штам яшчэ больш заразны і часцей прыводзіць да шпіталізацыі. Тым больш што ён небяспечны такімі ўскладненнямі, як з'яўленне тромбаў (якія прыводзяць да рызыкі развіцця інсультаў, гангрэн, тромбаэмбаліі лёгачных артэрый). А вірусолагі адзначаюць, што вірус імкнецца прыстасавацца.

СТАР. 5

«У нашай радавой памяці закладзена ўменне пераадольваць цяжкасці і перамагаць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Я ў дэталях ведаю, праз што вам давялося прайсці. Але вы прайшлі, і застаўся апошні, вырашальны крок. Правакацыі, булінг, псіхалагічны ціск, пагрозы. Гэтыя ўдары вы трымалі як сапраўдныя атлеты, праявіўшы цярпенне, волю і мужнасць. Цяпер такім жа чынам упэўнена трэба адстаяць гонар нашай Беларусі на арэнах Токіа перад мільёнамі гледачоў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

ПЕРАШКОДЫ ДАДАДУЦЬ СПАРТЫЎНАЙ ЗЛОСЦІ

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на Алімпіядзе будуць самыя моцныя сапернікі, пэўныя складанасці ствараць медыцынскія абмежаванні, узмоцнены кантроль з боку розных структур. Не выключаны і прэсінг з палітычным падтэкстам.

«Лозунг «Спорт па-за палітыкай!» даўно забыты. Забыты яшчэ з 1980 года. Але свежыя ўспаміны пра тое, як і з якімі надуманымі нагодамі калектыўны Захад разгарнуў агрэсіўнае цкаванне Савецкага Саюза. Не так і шмат гадоў прайшло — крыху больш за 40 — з адкрыцця XXII летніх гульняў у Маскве», — сказаў Прэзідэнт.

Аднак кіраўнік дзяржавы заўважыў, што любыя перашкоды толькі дададуць спартыўнай злосці. «Вы — беларусы. У нашай радавой памяці закладзена ўменне пераадольваць цяжкасці і перамагаць. Гэта пацвердзяць і нашы чэмпіёны, прызёры Алімпійскіх гульняў, ветэраны спорту. Вы адзіны калектыў, адна каманда. Побач з вамі трэнеры — мудрыя, прафесійныя, уважлівыя. Заставайцеся апорай адно для аднаго. Гэтыя імгненні праходзяць вельмі хутка, але яны застаюцца ў памяці. І ад вас залежыць, якімі яны будуць у вашай памяці», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што мільёны заўзятараў у Беларусі, нягледзячы на адлегласць у тысячы кіламетраў, будуць у думках пражываць кожную секунду на арэне. «Вашы імёны будуць гучаць у кожным доме. І я ўпэўнены, гучаць яны будуць з радасцю і гонарам. Памятайце, што за вамі — народ, які чакае падняты ў неба над Токіа Дзяржаўны сцяг Беларусі. Я шчыра жадаю вам поспеху. Як чалавек, які мае дачыненне да спорту, хачу сказаць: калі ласка, калі вы будзеце выходзіць на арэны, не перажывайце. Рабіце ўсё, як на трэніроўках. І тады ў вас усё атрымаецца. Мы будзем за вас не проста «хварэць», мы будзем за вас страшна перажываць. І жадаць перамогі ў кожную хвіліну, кожную секунду, на кожным метры. Я — асабліва», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў спартсменам не захварэць фізічна, быць у добрай форме і паказаць, на што яны здольныя. Прэзідэнт уручыў Дзяржаўны сцяг Беларусі капітану беларускай спартыўнай дэлегацыі Івану Ціхану. А спартсмены падарылі кіраўніку дзяржавы памятны сувенір — набор з 34 значкоў «Токіа-2020» з выявай летніх алімпійскіх відаў спорту, лагатыпа каманды Team BY і ўзораў, выкананых у выглядзе беларускіх культурных сімвалаў, аналагічных тым, што нанесены на спартыўную алімпійскую экіпіроўку.

Валерыя СЦЯЦКО.

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Пасля ўрачыстай цырымоніі провадаў удзельнікі падзяліліся ўражаннямі і, вядома, планамі на Алімпійскія гульні.

«Усё, што ні робіцца, усё да лепшага»

Для **капітана беларускай спартыўнай дэлегацыі Івана ЦІХАНА** Алімпійскія гульні ў Токіа шостыя ў кар'еры. Для сусветнага спорту з'ява выключная. Акрамя таго, спартыўную кар'еру лёгкаатлет спалучае з пасадай старшыні Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.

«Усё, што на нас цісне, усё, што вакол адбываецца, усё робіць нас мацнейшымі. І ўсё, што ні робіцца, усё да лепшага. Я па сабе ведаю. Калі я толькі прыходзіў у алімпійскую зборную, памятаю, што было больш прыемна выступаць, калі побач ёсць хтосьці са сваёй каманды. Неяк спакайней, больш упэўнена сябе адчуваеш. Ты глядзіш на свайго старэйшага таварыша, як ён сябе вядзе. І ў гэтым ёсць пераемнасць, перадача вопыту ад старэйшага пакалення да маладога. Я заўсёды дапамагу маладым спартсменам, калі трэба будзе. Нам нашы ветэраны наказалі быць як адна сям'я, а сям'я — гэта заўсёды адзін за аднаго. І пры дасягненні мэты гэта неабходны крытэрый, каб паказаць максімальны вынік. Калі мы будзем усе разам адзіныя, тады і ўсё атрымаецца. Канешне, мне пачэсна быць капітанам. Усё, што ад мяне залежыць, я зраблю, і нават немагчымае».

«Усе ідуць да пэўнай мэты»

Шэф беларускай місіі, віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Дзмітрый ДАЎГАЛЁНАК расказаў пра пэўныя арганізацыйныя моманты Алімпійскіх гульняў у Токіа.

«Ёсць агульная Алімпійская вёска. Адзінае, мне трохі незразумела, як сябе спартсмен будзе адчуваць унутры вёскі. Ведаючы гэтыя алімпійскія сталовыя, калі ёсць часы пік і падчас сняданку ў сталовай тры-чатыры тысячы чалавек... Трэніравальны і спаборніцкі рэжым адзін і той жа, спартсмены прачынаюцца прыкладна ў адзін час і прыкладна ў адзін час ідуць на сняданак. І як яны забяспечаць там сацыяльную дыстанцыю? Убачым на месцы. Важнае патрабаванне, што пасля прылёту, не праходзячы пашпартны кантроль, кожны будзе здаваць ПЦР-тэсты і каля дзвюх гадзін чакаць вынікі», — расказаў ён.

Таксама Дзмітрый Даўгалёнак звярнуў увагу, што спартсменам прыйдзецца спаборнічаць у няпростых каляспартыўных умовах: «У складзе нашай каманды людзі вопытныя, і ўсе ідуць да пэўнай мэты. Але ўсе нашы спартсмены падчас заваявання ліцэнзій, на чэмпіянатах свету і Еўропы ўжо траплялі ў гэтыя ўмовы. Міжнародны алімпійскі камітэт па апошняй перапісцы сказаў, што ў іх няма пярэчанняў па нашай дэлегацыі. Я б не сказаў, што санкцыі неяк паўплываюць на настрой спартсменаў. Тое, што спартсмены будуць атрымліваць у сацыяльных сетках, — яны ўжо да гэтага прызвычаіліся. Яны тут жывуць і цудоўна ўсё разумеюць. Для спартсменаў самае галоўнае — выступіць удала».

ВАЖНЫ РЭСУРС СТАБІЛЬНАСЦІ

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця кругласутачнага ваенна-патрыятычнага лагера на базе вайсковай часці 3214 унутраных войскаў МУС краіны ўзяла ўдзел старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.

Разам са спікерам верхняй палаты парламента сюды прыехалі таксама і кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў краіны, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, старшыня Мінгарвыканкама і іншыя зацікаўленыя асобы.

Старшыня Савета Рэспублікі выказала словы ўдзячнасці бацькам, якія адправілі сваіх дзяцей у гэты лагер, паколькі вельмі важна выхоўваць патрыётаў, грамадзян сваёй краіны. Бо моладзь з'яўляецца прадаўжальнікам традыцый, якія гадамі фарміраваліся ў нашай незалежнай Беларусі. А для нас моладзь — гэта будучыня краіны, таму маладзёжная палітыка з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі.

— Я дзякую афіцэрам унутраных войскаў за тое, што яны працуюць з хлопцамі, выконваючы пры гэтым асноўныя функцыі па ахове парадку, міру і спакою ў нашай краіне. Гэтыя хлопцы, якія прыйдуць вам на змену, будуць дапамагаць у гэтай працы, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Другой не менш важнай часткай знаходжання дэлегацыі высокіх гасцей стаў круглы стол на тэму «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне як важны рэсурс стабільнага развіцця дзяржавы». Падчас шчырай і прадметнай размовы спікер выказала ўдзячнасць Міністэрству ўнутраных спраў за арганізацыю ваенна-патрыятычных лагераў і запрасіла да дыскусіі ўдзельнікаў. Дарэчы, Наталля Качанава таксама выказала шэраг слушных прапаноў, у прыватнасці, распачынаць работу па грамадзянска-патрыятычным выхаванні ўжо з дашкольнага ўзросту. На яе думку, ваенна-патрыятычным лагерам абавязкова быць! «Нельга забываць аб подзвігу пакаленняў, якія адстаялі мір, свабоду і незалежнасць, тых, хто аднавіў з руін нашу краіну. І сёння вы, моладзь, павінны захаваць мір і спакой на нашай зямлі», — заўважыла старшыня Савета Рэспублікі.

Потым у размове з журналістамі спікер адзначыла, што з новага навучальнага года ў беларускіх школах уводзіцца пасада кіраўніка ваенна-патрыятычнага выхавання.

— Гэта абсалютна правільнае рашэнне. Тым больш мы бачым, што ў школах у нас мала мужчын-выкладчыкаў. А выхоўваць маладога чалавека павінны як жанчыны, так і мужчыны, — пераканана Наталля Качанава.

Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.

Ва ўрадзе

Разабрацца ў прычынах адставання і навярстаць

Такую задачу ставіць урад перад кіраўніцтвам Аршанскага рэгіёна

Днямі ў Оршы прайшло выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім аналізавалася рэалізацыя праграмы развіцця раёна на перыяд да 2023 года. Абмеркаваліпраблемы пры выкананні асобных падпраграм і мерапрыемстваў. Былі агучаны таксама прапановы аб магчымай іх карэкціроўцы (па тэрмінах рэалізацыі, аб'ёмах і крыніцах фінансавання).

МАРШРУТ ВЫЗНАЧАНЫ

Нагадаем, у студзені 2019 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна Віцебскай вобласці». Дакумент стаў дарожнай картай вырашэння ключавых праблем Аршаншчыны. Галоўныя мэты — стварэнне ўмоў для комплекснага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, павышэнне якасці і ўзроўню жыцця насельніцтва, стымуляванне прадпрымальніцтва, рост даходаў мясцовага бюджэту.

Для гэтага рэалізоўваецца шэраг эканамічных, фінансавых, падатковых, адміністрацыйных і стымуляцыйных мер. На тэрыторыі раёна ўстанаўліваецца адмысловы рэжым падаткаабкладання як для новых, так і для дзеючых суб'ектаў гаспадарання. У прыватнасці, прадпрыемствы вызваляюцца ад выплаты падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання, зніжаны стаўкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання да 1 %, паменшаны адлічэнні на пенсійнае страхаванне. Адтэрміноўка (растэрміноўка) па выплаце падаткаў адбываецца без налічэння працэнтаў за яе выкарыстанне.

Акрамя таго, у праграме прадугледжаны меры для развіцця інвестыцыйнай дзейнасці. Аршанскаму райвыканкаму дадзена права аператыўнага прыняцця рашэнняў наконт маёмасці, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца, пры гэтым знаходзіцца ў рэспубліканскай форме ўласнасці. На тэрыторыі раёна дазваляецца прымяненне будаўнічых і тэхнічных нормаў, устаноўленых у ЕС, ЕАЭС і КНР, з правядзеннем дзяржаўных экспертыз праектнай дакументацыі без яе адаптацыі да дзеючых нарматываў. Пры стварэнні або пашырэнні вытворчасцяў прадпрыемствы раёна вызваляюцца ад пакрыцця страт сельскагаспадарчай і лесагаспадарчай вытворчасцяў, а таксама ад кампенсацыйных выплат кошту выдаленых аб'ектаў расліннага свету.

Да 31 снежня 2023 года ўведзены мараторый на правядзенне выбарачных праверак, а для пазапланавых праверак вызначаны выключны пералік выпадкаў іх правядзення.

Ёсць і іншыя прэферэнцыі, бонусы, стымуляцыйныя фактары. Праз два з паловай гады надышоў час прыгледзецца, што з гэтага атрымліваецца? Які эфект? Ці сапраўды аршанскі вопыт можна выкарыстоўваць у іншых раёнах? Кіраўнік дзяржавы не раз гаварыў, што найбольш эфектыўныя меры па развіцці Аршанскага раёна будуць распаўсюджаныя і створаць аснову комплекснага плана мерапрыемстваў па развіцці рэгіёнаў.

МАНІТОРЫНГ НА МЕСЦЫ

Кіраўнік урада Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА перад пачаткам пасяджэння прэзідыума наведаў аб'екты рэгіёна. У іх ліку Аршанскі інструментальны завод, дзе рэалізоўваецца партнёрскі праект з вядучай міжнароднай кампаніяй па металаапрацоўцы Walter AG. У Оршы фактычна ствараецца новае прадпрыемства, якое будзе здольнае канкурыраваць з сусветнымі лідарамі.

Яшчэ адна лакацыя, дзе пабываў прэм'ер, — унікальны для Беларусі жывёлагадоўчы комплекс каля вёскі Чурылава на 2000 кароў, якія абслугоўваюцца робатамі. Ён адкрыўся ў канцы чэрвеня. Цяпер трэба там працаваць так, каб акупіліся інвестыцыі. Гэта магчыма пры адказных кадрах, прытрымліванні тэхналогій і рэгламентаў. Гэтыя важныя арганізацыйныя пытанні абмяркоўваліся на малочнатаварным комплексе падчас імправізаванай планёркі.

Каментуючы прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі бачанне таго, наколькі ўдала рэалізоўваецца праграма развіцця Аршаншчыны, прэм'ер-міністр нагадаў, што гэта пілотны праект для Беларусі і ў рамках яго рэалізацыі адпрацоўваецца ўзаемадзеянне органаў улады рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады па паскораным комплексным развіцці тэрыторыі.

Напрацаванае ўжо выкарыстоўваецца ў іншых рэгіёнах, канстатаваў Раман Галоўчанка. І хай не ўсё атрымліваецца, але нельга гаварыць, што эксперымент няўдалы, — эфект ад рэалізацыі праграмы ёсць. За два першыя гады рэалізацыі ўказа 82 % з тых мерапрыемстваў, якія павінны быць рэалізаваны, выкананы. Адставанне ў прамысловасці і сельскагаспадарчым комплексе.

Кіраўнік урада сказаў, што трэба будзе прааналізаваць выкананне кожнага праекта, каб зразумець, чаму нешта не атрымліваецца рабіць своечасова.

— Там, дзе гэта звязана з чалавечым фактарам, неразбярыхай кіравання, з безгаспадарчасцю, з не вельмі адказным выкананнем задач, гэта будзе выпраўлена, — падкрэсліў ён.

Выкананне праграмы «перазагрузкі» знаходзіцца на кантролі ўрада. Ажыццяўляецца маніторынг. У цэлым усё нядрэнна, і ёсць час яшчэ навярстаць адставанне, лічыць прэм'ер-міністр. На сёння, па яго словах, ужо засвоена 1 мільярд 400 мільёнаў рублёў. Цяпер важна, каб інвестыцыі давалі вынік.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Па палічках

МЕНШ НЕ БУДЗЕ

Што змяняецца ў зарплаце бюджэтнікаў з ліпеня?

З 1 ліпеня ўступілі ў сілу змены ў аплаце працы работнікаў бюджэтнай сферы. У чым іх сутнасць і як гэта адаб'ецца на нашых даходахХ Пра гэта нам расказала намеснік начальніка ўпраўлення аплаты працы ў бюджэтнай сферы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ЛУК'ЯНЧЫКАВА.

— Таццяна Анатольеўна, з чым звязана ўвядзенне змен у аплаце працы?

— У адпаведнасці з даручэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, у 2020 годзе была створана рабочая група па пытаннях рэалізацыі Указа Прэзідэнта ад 18 студзеня 2019 г. № 2(. У яе склад увайшлі прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і Камітэта дзяржаўнага кантролю. Рабочай групай была праведзена аналітычная праца, у тым ліку з выездам на месцы, накіраваная на вырашэнне праблемных пытанняў, якія ўзніклі ў арганізацыях пры прымяненні нормаў Указа № 2(.

Падчас названай працы неаднаразова ўказвалася на фактычную страту стымуляцыйнай функцыі прэміі, паколькі Указам № 2(вызначана, што на яе выплату накіроўваюцца сродкі ў памеры пяць працэнтаў ад сум акладаў работнікаў, а нявыкарыстаныя сродкі, прадугледжаныя на аплату працы, накіроўваюцца на прызначэнне стымуляцыйных, акрамя прэміі, і кампенсацыйных выплат.

Гэта прывяло да неабходнасці ўстанаўлення дзяржаўнымі органамі надбавак, якія дублююць функцыі прэміі. Але, як вядома, і работнікам, і кіраўнікам арганізацый больш зразумела і звыкла матэрыяльнае стымуляванне з улікам ацэнкі вынікаў штомесячнай працы з выкарыстаннем прэміі ў больш высокіх памерах.

На падставе прапаноў рабочай групы выдадзены Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2020 г. № 482, якім унесены змяненні ва Указ № 2(.

— Што ўсё ж такі зменіцца ў нашых зарплатах, якія мы атрымаем ужо за ліпень?

— У адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы, з 1 ліпеня 2021 года на прэміраванне работнікаў бюджэтных арганізацый будуць накіроўвацца сродкі ў памеры 20 % ад сумы іх акладу. Нагадаю, што да 1 ліпеня на прэміраванне накіроўваліся сродкі ў памеры 5 % ад сумы акладу работнікаў. У гэтай сувязі варта асабліва звярнуць увагу, што дадзеная мера не накіравана на павышэнне зарплаты бюджэтнікаў. Павелічэнне прэміравання будзе ажыццяўляцца ў межах бюджэтных асігнаванняў, якія прадугледжаны на бягучы год. Гэта значыць, што адбудзецца пераразмеркаванне паміж элементамі заработнай платы шляхам карэкціроўкі памераў асобных стымуляцыйных выплат. Важным новаўвядзеннем з'яўляецца таксама тое, што на прэміраванне будуць накіроўвацца і нявыкарыстаныя сродкі, прадугледжаныя на аплату працы.

— Многія апасаюцца, што зарплата стане меншай...

— Адназначна меншай яна не стане. Прадугледжаныя карэкціроўкі стымуляцыйных выплат ні ў якім разе не павінны прывесці да памяншэння заработнай платы работнікаў, што было ўстаноўлена да 1 ліпеня 2021 года. Натуральна, пры ўмовах аднолькавай працягласці рабочага часу, роўнай напружанасці, якасці працы і пры іншых умовах.

— Ці ёсць мяжа прэмій?

— Нормы ўказа накіраваны на ўзмацненне ролі прэмій у аб'ёме стымуляцыйных выплат работніка. Тым самым будзе павышацца матывацыя работніка на добрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў. Што датычыцца памеру прэмій, то указам вызначаны толькі аб'ём сродкаў, якія накіроўваюцца на прэміраванне. А канкрэтны памер прэміі вызначаецца ў адпаведнасці з палажэннем, якое зацвярджае кіраўнік бюджэтнай арганізацыі. Гэта значыць, усё залежыць ад работніка і якасці работы, якая выконваецца.

— Якую колькасць работнікаў закрануць гэтыя навацыі?

— Каля 800 тысяч работнікаў бюджэтнай сферы. Прычым закрануць яны кожнага работніка. Бо прэмія — гэта асноўны від выплаты, і ён ёсць у кожнага.

— Мяркуецца павялічыць і дапамогу да адпачынку. Тыя, хто плануе яго ў жніўні, ці могуць разлічваць на новую суму?

— Сапраўды, указам прадугледжана яшчэ адна прыемная для работніка мера — гэта павелічэнне аднаразовай выплаты на аздараўленне з 0,5 да аднаго акладу. Але гэта мера прадугледжана з 1 студзеня 2022 года. Сёлета дзейнічае ранейшы памер аднаразовай выплаты на аздараўленне — 0,5 ад акладу работніка.

Паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у бягучым годзе назіраецца апераджальны рост тэмпаў заработнай платы бюджэтнікаў у параўнанні з ростам заработнай платы па краіне ў цэлым. У работнікаў бюджэтнай сферы ён складае 11(%, пры тым што ў цэлым па краіне за студзень — май заработная плата выросла на 115 % . Суадносіны заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы да сяроднерэспубліканскага ўзроўню складаюць каля 81 %.

Асноўную ўвагу ў міністэрстве, у адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы, удзяляюць заработнай плаце педагагічных работнікаў, у тым ліку настаўнікаў, а таксама медыцынскіх работнікаў — урачоў і сяродняга медыцынскага персаналу. Да 2025 года суадносіны заработнай платы педагагічных работнікаў да заработнай платы па краіне павінны складаць 100 %, урачоў — 150 %.

Алена КРАВЕЦ.

Наша пазіцыя

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — НЕ КРЫНІЦА КАНФРАНТАЦЫІ

Па ініцыятыве Беларусі ўчора адбылося мерапрыемства ў рамках 4Н-й сесіі Савета ААН па правах чалавека, якая праходзіць у Жэневе (Швейцарыя), на тэму «Правы чалавека на Захадзеі адсутнасць міжнароднага кантролю і рэакцыі на парушэнні правоў чалавека». Пра гэта паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі.

Мерапрыемства было арганізавана пры падтрымцы пастаянных прадстаўніцтваў Венесуэлы, Кітая і Расіі ў Жэневе.

Начальнік галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Беларусі Ірына Вялічка прадставіла ўдзельнікам дыскусіі даклад МЗС «Найбольш рэзанансныя выпадкі парушэння правоў чалавека ў асобных краінах свету», выпушчаны 30 чэрвеня 2021 года.

Беларускі дыпламат у сваім выступленні адзначыла, што прадстаўленыя ў дакладзе факты сведчаць пра шматлікія і сістэмныя парушэнні правоў чалавека ў краінах Захаду. Рэкамендавана заходнім краінам заняцца сваімі праблемамі ў гэтай галіне, а не вінаваціць іншыя дзяржавы. Асаблівы акцэнт зроблены на неабходнасці вярнуць першапачатковы сэнс паняццю «правы чалавека» ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і зрабіць іх рэальным фактарам дабрабыту і ўстойлівага развіцця грамадстваў і дзяржаў, а не крыніцай канфрантацыі і палітычных прэтэнзій.

У ходзе мерапрыемства таксама выступіў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэй Савіных.

Прадстаўнікі міжнародных акадэмічных колаў і няўрадавых арганізацый, якія выступілі ў ходзе тэматычнай дыскусіі, адзначылі наяўнасць праблем з сітуацыяй з правамі чалавека ў краінах калектыўнага Захаду і выступілі за неабходнасць маніторынгавага працэсу з боку міжнароднай супольнасці па гэтым пытанні.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Расія абвінавачвае ЗША ў беспрэцэдэнтным умяшанні ў выбары ў Малдове

Прадстаўнікі ЗША і ЕС ажыццяўляюць беспрэцэдэнтныя спробы ўмяшання ў перадвыбарчую кампанію ў Малдове, заявіла на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава.

Па яе словах, «МЗС РФ неаднаразова звяртаў увагу на недапушчальнасць адкрыта ангажыраваных заяў і каментарыяў з выпадамі ў адрас палітычных апанентаў». Але заклікі не былі пачутыя, і вынікам сталі абвастрэнне ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Малдове і палярызацыя грамадства, заявіла дыпламат. Таксама прадстаўнік МЗС адзначыла, што Расія заўсёды выступала і выступае ў падтрымку дзяржаўнага суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Малдовы.

Раней былы прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон расказаў пра тое, што заходнія дыпламаты актыўна ўмешваюцца ў малдаўскі выбарчы працэс.

У Польшчы прадпрымальнікі падалі ў суд з-за лакдаўну

У Польшчы 150 прадпрымальнікаў, якія прадстаўляюць больш чым 500 фітнес-клубаў, падалі калектыўны іск у Акруговы суд Варшавы супраць Дзяржаўнага казначэйства краіны, паведамляе польскі часопіс Wprost.

Прадпрымальнікі лічаць, што пастанова аб увядзенні ў Польшчы каранціну з-за пандэміі каранавіруса была незаконнай і парушала Канстытуцыю. Прадстаўнікі бізнесу разлічваюць, што ўлады возьмуць на сябе адказнасць за панесеныя прадпрыемствамі страты.

«На самай справе, з пункту гледжання закона, ніхто з нас не павінен быў закрывацца, — заявіў кіраўнік Польскай федэрацыі фітнесу Томаш Напяркоўскі. — Аднак былі запалохванні, ціск, накладанне штрафаў, якія, як мы ведаем, цяпер масава адмяняюцца».

Томаш Напяркоўскі адзначыў, што рашэнне аб закрыцці прыватных кампаній у Польшчы рабілася на падставе распараджэння ўрада. Аднак у адпаведнасці з Канстытуцыяй краіны такое рашэнне можа быць прынята дзяржавай толькі на падставе закона. Такім чынам, увядзенне лакдаўну было незаконным.

Кітай паспрабуе ўратаваць Зямлю ад «астэроіда апакаліпсіса» 900-тоннымі ракетамі

Эксперты Нацыянальнага цэнтра касмічнай навукі Кітая апублікавалі план запуску ў космас ракетнага комплексу. З яго дапамогай хочуць змяніць напрамак палёту астэроіда Бену і адправіць яго далей ад Зямлі.

У перыяд з 21(5 да 2199 года астэроід Бену наблізіцца да нашай планеты на адлегласць да (,5 млн км. Зараз яго класіфікуюць як патэнцыйна небяспечны астэроід.

Кітайцы правялі камп'ютарнае мадэляванне і высветлілі, што адначасовы ўдар 23 ракет 4ong ! arch 5, кожная вагой каля 900 т, можа збіць Бену з курсу і забяспечыць яго пралёт міма Зямлі без якіх-небудзь разбуральных наступстваў.

«Удары астэроідаў уяўляюць сур'ёзную пагрозу для ўсяго жывога на Зямлі. Адхіленне астэроіда ад траекторыі сутыкнення мае вырашальнае значэнне для памяншэння гэтай пагрозы», — піша інжынер Мінтаа Лі з Нацыянальнага цэнтра касмічных даследаванняў у Пекіне.

Падыход, прапанаваны кітайскай камандай, дазволіў бы ўбачыць, як некалькі ракет адначасова ўдараюць па паверхні Бену. Перад гэтым яны патрацілі б каля трох гадоў на шлях ад Зямлі да астэроіда. Вучоныя палічылі, што пры падзенні на Зямлю яго хуткасць складзе 12,86 кмф, а вось дакладныя наступствы такога кантакту прадказаць пакуль ніхто не бярэцца.

МАЛАДЗЁЖНЫ ПРАЕКТ

У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

Дзень моладзі на «Славянскім базары ў Віцебску» сёлета будзе больш маштабны

Пра гэта паведаміў «Звяздзе» першы сакратар Віцебскага абкама БРСМ Уладзімір БАБІЧАЎ.

Сёлета дні моладзі арганізуюць у рамках афіцыйнай праграмы «Базару» 16 і 1(ліпеня. Па-ранейшаму эпіцэнтрам падзей стане адна з самых вялікіх плошчаў Еўропы — Перамогі. Арганізатары свята правялі рэбрэндынг: цяпер гэта фэст творчасці «Запальвае моладзь».

Сярод афіцыйных падзей — канферэнцыя, прысвечаная дзейнасці Міжнароднага саюза грамадскіх арганізацый «Расійска-Беларускі саюз моладзі».

Шмат мерапрыемстваў будзе падчас фестывалю. У прыватнасці, сто маладых аматараў забегаў, якія першымі зарэгіструюцца да 16 ліпеня на афіцыйных старонках БРСМ у інтэрнэце, змогуць пазмагацца за галоўны прыз — веласіпед. Прабегчы трэба больш як шэсць кіламетраў.

Відовішчным стане арт-парад: хлопцы і дзяўчаты з усіх куткоў Беларусі, а таксама госці свята пройдуць па адной з галоўных вуліц Віцебска — Леніна. І на плошчы Перамогі правядуць конкурсы вакалістаў, харэаграфічных і арыгінальных жанраў (фокуснікі, барабаншчыцы, мажарэткі). Можна будзе сыграць у настольныя гульні, міні-футбол, баскетбол... Адбудуцца спаборніцтвы маладых гіравікоў на кубкі Саюзнай дзяржавы і старшыні аблвыканкама.

Упершыню маладзёжны фэст завершыцца феерверкам на плошчы Перамогі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Юрыю Вітольдавічу Шулейку, старшыні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Ляхавіцкі раённы выканаўчы камітэт і раённы Савет дэпутатаў выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Шулейку Юрыю Вітольдавічу ў сувязі з горам, якое напаткала яго, — смерцю БАЦЬКІ.

Без тэрміну даўнасці

ЛЮДЗІ ЗАБЫВАЮЦЬ, ДАКУМЕНТЫ — ПОМНЯЦЬ

Чаму нам сёння нельга замоўчваць усе факты, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной?

Падзеі Другой сусветнай апошнім часам становяцца прадметам шматлікіх дыскусій. Найбольш трагічны для нас, беларусаў, гістарычны перыяд, на жаль, часта выкарыстоўваецца ў палітычных мэтах. Нам спрабуюць навязаць «новыя» варыянты ваенных падзей, дыскрэдытуюцца іх удзельнікі, увогуле ставіцца пад сумнеў роля савецкага народа ў Перамозе над фашызмам. Мы вельмі доўга маўчалі. Не хацелі псаваць адносіны з краінамі-суседзямі, не ставілі мэты ачарніць продкаў тых, хто сёння змагаецца за «справядлівасць» у Беларусі. Аднак прыйшоў час паставіць усе кропкі над «і». Як кажуць, найлепшы аргумент — дакумент. У новай рубрыцы, якую «Звязда» неўзабаве распачне з Нацыянальным архівам, мы будзем публікаваць новыя дакументы, якія пацвярджаюць, што Вялікая Айчынная вайна пераўзышла ўсе ваенныя канфлікты — у першую чаргу, па жорсткасці і бесчалавечнасці. За многімі зверствамі, якія ўчынілі на беларускай зямлі акупанты, стаяць не военачальнікі, а звычайныя людзі, у тым ліку тыя, каго мы доўгі час лічылі «сваімі».

Чаму нам аб гэтым нельга маўчаць, няпрэдадні прэм'еры рубрыкі «Без грыфа «сакрэтна» мы пагутарылі з яе суаўтарам, вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдатам гістарычных навук Вячаславам СЕЛЯМЕНЕВЫМ.

Фота аўтара.

Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎІ «Па кожнай акупаванай вобласці краіны падрыхтаваны зборнікі дакументаў аб злачынствах, здзейсненых нямецкімі акупантамі і іх памагатымі».

— Вячаслаў Дзмітрыевіч, Генеральная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу аб генацыдзе ў дачыненні да насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. Чаму спахапіліся толькі праз 76 гадоў пасля Перамогі?

— Тое, што мы вярнуліся да гэтай тэмы толькі цяпер, — наша віна. Беларуская талерантнасць амаль праз восем дзесяцігоддзяў пасля Перамогі нам вылілася бокам. За апошні час мы напрацавалі вялікую базу крыніц, у тым ліку па тэме генацыду беларускага народа.

«Адно скажу дакладна: сёння па Беларусі мы выходзім на лічбу звыш 9300 спаленых вёсак, а не 9200, як было прынята меркаваць доўгі час. І «сясцёр» у Хатыні не 185, а значна больш».

Па кожнай акупаванай вобласці краіны падрыхтаваны зборнікі дакументаў аб злачынствах, здзейсненых нямецкімі акупантамі і іх памагатымі ў адносінах да мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзве кнігі, прысвечаныя Віцебскай і Гомельскай абласцям, ужо выдадзены. Зборнікі складаюцца з дзвюх частак. У першай, прысвечанай нацысцкай палітыцы генацыду і выпаленай зямлі, прыводзяцца дакументы аб злачынствах акупантаў і іх памагатых.

Гэта дакументы выключна ваеннага перыяду. Прычым прадстаўлены не толькі савецкія, але і нямецкія дакументы: у прыватнасці, данясенні карных вайсковых падраздзяленняў, якія прымалі ўдзел у здзяйсненні ваенных злачынстваў. У другім раздзеле зборнікаў адлюстраваны ўстанаўленне фактаў і расследаванне ваенных злачынстваў. Публікуюцца паказанні ваенных злачынцаў, сведкаў падзей. З КДБ нам перадалі 289(крымінальных спраў на замежных ваеннапалонных, якіх асудзілі за ваенныя злачынствы. Іх паказанні шырока прадстаўлены ў гэтых шасці тамах. Прычым у гэтых справах — матэрыялы не толькі па Беларусі, але і па Расіі, Украіне. Ваеннапалонных судзілі не па месцы здзяйснення злачынства, а там, дзе яны адбывалі пакаранне.

— Вельмі каштоўная інфармацыя для кожнага з рэгіёнаў утрымліваецца ў дадатках да згаданых зборнікаў...

— У кожным зборніку змешчана па чатыры дадаткі. Прыводзяцца спісы месцаў прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі вобласці, месцаў масавага знішчэння яўрэяў (дзе было забіта 20 і больш чалавек), буйных карных аперацый, якія былі праведзены ў кожным рэгіёне. Акрамя таго, пералічаны сельскія населеныя пункты, знішчаныя акупантамі поўнасцю і часткова. Мы называем іх менавіта так, бо спалены былі не толькі вёскі, але і сёлы, пасёлкі, хутары, фальваркі. Сюды ўключаны населеныя пункты, у якіх было знішчана не менш за 25 % жылля. У Віцебскай вобласці такіх — 3542, у Гомельскай — 1454. І гэтыя лічбы не канчатковыя.

— Атрымліваецца, што афіцыйная лічба — 9200 спаленых беларускіх вёсак у гады Вялікай Айчыннай вайны — таксама недакладная?

— У нас дзясяткі вёсак, па якіх ёсць інфармацыя, што яны былі знішчаны акупантамі. Але колькі было спалена хат, колькі загінула жыхароў, у многіх выпадках мы не ведаем. Як з упэўненасцю не скажам і таго, колькі канкрэтна населеных пунктаў знішчана, аднаўлена і неаднаўлена пасля вайны. Адно скажу дакладна: сёння па Беларусі мы выходзім на лічбу звыш 9300 спаленых вёсак, а не 9200, як было прынята меркаваць доўгі час. І «сясцёр» у Хатыні не 185, а значна больш.

Мы публікуем дакументы, што ў Слонімскім раёне была знішчана вёска Воўчыя Норы, у якой да вайны налічвалася каля 190 хат. Вёску знішчылі, ёсць сведкі, але вы не знойдзеце аб гэтым ніякіх публікацый. Або дзесьці стаіць помнік, на ім пазначана, што вёска была спалена, але ні ў кнізе «Памяць», ні ў іншых крыніцах гэтая інфармацыя не пацвярджаецца. І такіх вёсак, якія зніклі з нашай памяці, шмат. Гэта гаворыць аб тым, што тэма да канца не вывучана. Па спаленых вёсках няма ніводнага навуковага даследавання. Нашу нявывучанасць праблемы немцы выкарыстоўваюць у сваіх мэтах.

— Прынята лічыць, што большасць населеных пунктаў у гады вайны было спалена падчас карных аперацый.

— Сапраўды, вельмі шмат вёсак акупанты і іх памагатыя спалілі падчас карных аперацый, але колькі іх было знішчана падчас адступлення гітлераўцаў! Ішлі каманды факельшчыкаў і палілі ўсё на сваім шляху. Насельніцтва маглі не чапаць, а хаты знішчалі. Гэта рабілі і салдаты вермахта. Сёння ж, па меркаванні большасці немцаў, злачынствы ў дачыненні да мірнага насельніцтва здзяйснялі эсэсаўцы, групы СД. Аднак паказанні замежных ваеннапалонных сведчаць: да злачынстваў супраць мірных жыхароў прыклаў руку і вермахт. Ён жа стварыў лагер смерці ў «Азарычах». Ёсць сведчанні вайскоўцаў, у тым ліку генералаў, якія аддавалі каманды па арганізацыі лагера. Хто ведае аб гэтым у Германіі?

— Сучасныя немцы шмат чаго не ведаюць. Як сёння данесці Захаду, якія жахі ў гады Вялікай Айчыннай вайны адбываліся на тэрыторыі Беларусі?

— У іх няведанні — таксама наша віна. Я знайшоў цікавы дакумент. У 1980-х гадах выдавалася кніга сакратара Мінскага падпольнага гаркама партыі Савелія Лящчэні «З паролем гаркама». Падчас падрыхтоўкі выдання аўтару зрабілі заўвагу, што ён прыводзіць шмат фактаў аб зверствах акупантаў. Кніга, маўляў, можа трапіць у ФРГ і выклікаць негатыўную рэакцыю. Правільна Прэзідэнт наш сказаў: Ізраіль змог данесці аб Халакосце так, што дагэтуль немцы, якія прыязджаюць у гэтую краіну, перш ідуць да помнікаў і просяць прабачэння. А ў Беларусі, дзе знішчылі кожнага трэцяга жыхара, пачынаюць панукваць па новай. Калі стварылі Хатынь, кожная ўрадавая дэлегацыя, якая прыязджала ў нашу краіну, ехала да мемарыяльнага комплексу. Сёння замежныя дэлегацыі там рэдкасць. Вось і не ведаюць заходнія палітыкі, якія зверствы ўчыняліся на нашай тэрыторыі, або не хочуць ведаць.

— Праблема, напэўна, заключаецца яшчэ і ў тым, што па некаторых пытаннях няма канкрэтна сфармуляванага паняційнага апарату...

— Узяць хоць бы «Азарычы». На Нюрнбергскім працэсе яны праходзяць як канцлагер. У нашым даведніку пазначаны як «лагер на пярэднім краі нямецкай абароны». Мы самі панізілі статус лагера. Што такое «Бронная Гара» на Брэстчыне — месца знішчэння або канцлагер? Ці той жа «Трасцянец»? З аднаго боку, гэта месца масавага знішчэння людзей. З іншага — там быў створаны працоўны лагер мінскага СД: зняволеныя выконвалі патрэбы акупантаў па рамонце адзення, пашыву абутку. Гэта не быў канцлагер такога кшталту, як «Асвенцім» ці «Майданэк», але тут таксама знішчалі людзей. У нас абсалютна не выпрацаваны паняційны апарат, чым карыстаюцца заходнія гісторыкі. Нашы навукоўцы мала цікавяцца гэтай тэмай.

— Між тым дакладная колькасць знішчаных у «Трасцянцы» сёння так і застаецца нявызначанай.

— Сёння некаторыя эксперты нам раяць рабіць раскопкі. Якія могуць быць раскопкі, калі з другой паловы 1942 года немцы ўжо ведалі, што будуць сыходзіць з акупаванай тэрыторыі, таму стварылі спецыяльную каманду, якая займалася знішчэннем трупаў. Ад людзей застаўся толькі попел. Надзвычайная дзяржаўная камісія вызначала колькасць загінулых па памеры ям, па колькасці попелу, а не чалавечых астанкаў.

У шматлікіх месцах масавага знішчэння людзей немцы паспелі пазбавіцца ад трупаў. Гэта пацвярджаецца дакументамі. Таму лічба, якую мы ведаем як колькасць знішчаных у «Трасцянцы», вельмі адносная. Адзінае, за што можна зачапіцца: калі немцы падымалі трупы, яны дакладвалі аб іх колькасці ў Берлін. Толькі дзе сёння шукаць гэтыя дакументы?

— А ці працавалі нашы даследчыкі ўвогуле з нямецкімі дакументамі па тэме Вялікай Айчыннай?

— Толькі апошнім часам мы актыўна пачалі вывучаць нямецкія дакументы. Аднак трэба разумець, што адну частку дакументаў захапіў Савецкі Саюз, другую — амерыканцы, якія, як толькі атрымалі трафейныя дакументы, зрабіўшы копіі, пачалі іх прадаваць. Захопленае нашымі войскамі вывезлі ў Маскву, дзе стварылі асобны архіў, але да гарбачоўскай перабудовы гэтыя дакументы ляжалі нікім не запатрабаваныя. Некаторыя нашы гісторыкі працавалі з імі, аднак гэта былі адзінкавыя людзі. Праблема заключалася яшчэ і ў тым, што да 1990-х гадоў амаль усе дакументы па вайне знаходзіліся на сакрэтным захоўванні, у тым ліку дакументы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі. Сёння ў нашым архіве мы рассакрэцілі практычна ўсё. Нядаўна Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі выставіў у адкрытым доступе шэраг трафейных дакументаў. Аднак цяпер іншая праблема: тэмай Вялікай Айчыннай вайны мала хто хоча займацца. Мы стварылі вялізную базу апублікаваных дакументаў, а даследчыцкая праца стаіць на месцы.

— А ці ёсць гістарычныя сенсацыі ў гэтых дакументах?

— КДБ нам перадаў пратаколы допыту ваеннаслужачых батальёна Дырлевангера, на якім — і кроў жыхароў Хатыні. Дакументы сведчаць, што ў гэтым батальёне была і беларуская рота. Аказваецца, калі батальён перакінулі ў Лагойск, да яго далучылі і беларусаў. Рота праіснавала літаральна некалькі месяцаў. Беларусаў судзілі адначасова з украінцамі, якія таксама служылі ў батальёне.

— Тэма калабарацыі вельмі доўга замоўчвалася...

— Паліцэйскія фарміраванні з ваеннапалонных пачалі ствараць ужо ў жніўні 1941 года. Немцы сутыкнуліся з жорсткім супраціўленнем на тэрыторыі Беларусі, у іх не хапала карных атрадаў. Яны нават не разлічвалі, што ім прыйдзецца ачышчаць свае тылавыя раёны ад партызан. Акупанты першапачаткова пачалі рабіць стаўку на ўкраінцаў. Дарэчы, унутраную ахову Шталага-352 у Масюкоўшчыне складалі ўкраінцы.

Выкарысталі акупанты ў сваіх мэтах і тое, што Савецкі Саюз аб'явіў сваіх ваеннапалонных ворагамі народа. Трэба мець на ўвазе, што некаторыя ішлі ў калабарацыянісцкія фарміраванні з меркантыльных меркаванняў: яны разумелі, што іначай іх чакае смерць ад голаду, а тут, можа, атрымаецца ўцячы. Да канца 1942 года гэты працэс набыў такі маштаб, што Цэнтральны штаб партызанскага руху прымае спецыяльную дырэктыву, згодна з якой ставілася задача не толькі ваяваць з гэтымі фарміраваннямі, але і працягваць людзей на свой бок. Многія перайшлі да партызан. Ім абяцалі ўсё забыць, але, як скончылася вайна, усё адразу ўспомнілі і амаль усіх пазбавілі волі.

Такім чынам, вайна не двухкаляровая — не чорная і белая. Яна вельмі розная. Гэта страшная старонка ў нашай гісторыі. І судзіць людзей, якія яе перажылі, вельмі складана.

Вераніка КАНЮТА.

«СТАЛІ ЧАСЦЕЙ БЕЗ МАСАК ХАДЗІЦЬ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер хвароба можа праходзіць без страты нюху (сімптом ковіду, які быў яго галоўным маркерам), а значыць, ковід можна зблытаць з ВРВІ і своечасова не прыняць адпаведных мер. Шостага ліпеня ў суседняй Расіі за суткі ад каранавіруса памерлі (3(чалавек — гэта максімальны паказчык з пачатку пандэміі. У Беларусі на гэты ж дзень, паводле звестак Міністэрства аховы здароўя, з пачатку пандэміі зарэгістраваны 422 521 чалавек са станоўчым тэстам на ЦМVIA-19 (выздаравелі 415 363 пацыенты, але вірус забраў жыцці 3204 чалавек, паведамляюць «Мінск-Навіны»).

Медыкі не стамляюцца рэкамендаваць насіць маскі і сёння паўтараюць пра гэта яшчэ больш настойліва: без гэтага ахоўнага сродку нельга ні ў краму, ні ў грамадскі транспарт, ні ў кіно, ні на работу. Але наколькі ў паўсядзённым жыцці мы прыслухоўваемся да гэтых рэкамендацый?

«ЦЯПЕР ТРЭБА БЫЦЬ АДКАЗНЫМІ»

У гандлёвай зале гіпермаркета раніцай у будні дзень няшмат наведвальнікаў. «Глядзі, усе ў масках», — пераконвае мужа жанчына сярэдніх гадоў. Той упарціцца: маўляў, забыў маску дома, не вяртацца ж, а купляць не хочацца. «У цябе ж ёсць маска, вось ты на касе тавар і аплаціш», — пярэчыць ён жонцы. Сапраўды, надзяваюць маскі пакупнікі ў асноўным на касе, дзе іх аб гэтым просяць. У гандлёвай зале маскі — хутчэй сімвал ветлівасці: яны ёсць, але часцей — на падбародку. Правільна носяць маскі толькі адказныя адзінкі.

Уласна кажучы, масачны рэжым быў уведзены яшчэ восенню. Але просьба насіць маскі ў грамадскіх месцах мае толькі рэкамендацыйны характар: штраф пакупнікам без масак не пагражае. Вядома, насіць маску ў спякоту — так сабе задавальненне. Але ці вартае збавенне ад невялікіх нязручнасцяў магчымасці страты здароўя або нават жыцця?

Медыкі не стамляюцца рэкамендаваць насіць маскі і сёння паўтараюць пра гэта яшчэ больш настойліва: без гэтага ахоўнага сродку нельга ні ў краму, ні ў грамадскі транспарт, ні ў кіно, ні на работу.

— Не магу насіць маску доўга ў такую спякоту — цяжка дыхаць, — усміхаецца маладая мама з двума няўрымслівымі малымі. — У гандлёвай зале, вядома, халадней, чым на вуліцы, але ўсё роўна мне вельмі горача. У мяне блізняты, два з паловай гады, увесь час даводзіцца за імі бегаць — то за адным, то за другім. А наогул, апошнім часам заўважаю, што людзі сталі часцей без масак хадзіць — надакучыла ім гэта ўсё. Але я ў грамадскіх месцах заўсёды стараюся надзяваць маску, хоць бы сімвалічна, бо гэта павага да навакольных.

Пенсіянерка Галіна Уладзіміраўна — іншага меркавання:

— Я пажылы чалавек, уваходжу ў групу рызыкі. Так што асабіста для мяне масачны рэжым не заканчваўся з вясны 2020 года. Вось мае дзеці і ўнукі цяпер маскі не носяць. Моладзь несур'ёзна ставіцца да свайго здароўя, я лічу. Думаю, можа, прышчапіцца ад ковіду? Пакуль чытаю пра «за» і «супраць», яшчэ не вырашыла. У мяне шмат хранічных захворванняў, так што не ведаю, як перанясу вакцыну.

— І я надзяваю маску абавязкова — няважна: у краму, у транспарт, на рынак ці яшчэ куды-небудзь, — уступае ў размову пажылы мужчына. — А моладзі трэба рабіць заўвагі. І ўвогуле не абслугоўваць без масак на касе. Каб людзі задумаліся аб сваёй бяспецы. Цяпер, калі прыйшоў індыйскі штам, трэба быць адказнымі: і ў адносінах да сябе, і да навакольных.

Прыхільнікаў масачнага рэжыму нямала і сярод моладзі, і сярод людзей сярэдніх гадоў.

— Не згодная з тым, што цяпер людзі перасталі насіць маскі, — кажа Алена. — На рабоце я абавязаная насіць маску, цяпер я ў адпачынку, але ўсё адно выкарыстоўваю гэты ахоўны сродак — і ў закрытых памяшканнях, і нават на вуліцы. Мне здаецца, гэта ў пачатку лета ўсе расслабіліся, а цяпер зноў пачалі абараняць сябе ад ковіду. Бачу гэта па сваіх знаёмых, сябрах. Сяброўка не насіла маску, потым захварэла, павысілася тэмпература. Дзякуй Богу, аказалася, звычайнае ВРВІ. Але з тых часоў яна носіць маску, куды б ні ішла. Бо маска абараняе не толькі ад ковіду, але і ад іншых вірусных інфекцый. Рызыка заражэння зніжаецца яшчэ і таму, што ў масцы нязручна дакранацца рукамі да твару — а гэта адзін са спосабаў перадачы віруса.

Мужчына, якога жонка пераконвала надзець маску, настроены скептычна:

— Ці часта я нашу маску? Не. У транспарце, у краме, калі не забыў яе дома. Але галоўным чынам для таго, каб не раздражняць людзей, якія баяцца ковіду. Маё меркаванне — небяспека заразіцца, вядома, ёсць, і ковід можа нават забіць. Але не варта перабольшваць. Мне наогул здаецца, у наш час лепш за ўсё быць у нейкай меры фаталістам. Тым больш калі на вас маска, гэта не значыць, што вы цалкам абаронены, — колькі пра гэта ўжо казалі ўрачы.

— А я зрабіў прышчэпку ад ковіду, мне цяпер баяцца няма чаго, — усміхаецца яшчэ адзін пакупнік, які прадставіўся Алегам. — На касе, вядома, надзену маску, каб не ўступаць у спрэчкі, толькі для гэтага яе з сабой і нашу.

Дарэчы, афіцыйнае меркаванне медыкаў — выкарыстанне ў грамадскіх месцах сродкаў індывідуальнай аховы абавязковае і для прышчэпленых, і для непрышчэпленых грамадзян.

— Чалавек, які перахварэў на ковід ці зрабіў прышчэпку, лічыць, што ён у бяспецы. Але ў нас патрабаванні для ўсіх адны і тыя ж: наведвальнік абавязкова павінен быць у масцы, — кажа касір Кацярына Кныш. — Таму мы заўсёды просім, каб пакупнікі надзявалі маску як трэба — на нос і рот. Звычайна людзі рэагуюць добразычліва, згаджаюцца правільна надзець маску і нават просяць прабачэння. Але бывае, хоць і рэдка, што і спрачаюцца, і лаюцца, і нават пакупкі на касе кідаюць. Але ж нас можа пакараць кіраўніцтва за абслугоўванне пакупніка без маскі, таму што нашу работу кантралююць камеры. І наша кіраўніцтва таксама могуць аштрафаваць за бязмасачных наведвальнікаў. Так што, калі ласка, данясіце да людзей, што трэба насіць маскі ў краму, з прышчэпкай вы або без прышчэпкі, баіцеся вы каранавіруса або не баіцеся. Так вы зможаце засцерагчы сябе і іншых ад праблем са здароўем, а супрацоўнікаў крам — яшчэ і ад штрафаў.

Ахоўнік гіпермаркета згодны з касірам:

— Гэта не жаданне вас пакрыўдзіць, гэта патрабаванне бяспекі. І, мне здаецца, яно правільнае. Паглядзіце, колькі ўскладненняў пасля ковіду! А калі забыліся маску, мы прапануем купіць на касе. Яна зусім недарагая, менш чым два рублі.

«ПРОСТА ПАВАГА ДА ЛЮДЗЕЙ»

Калі ў крамах і на рынках людзі імкнуцца ўсё ж больш-менш абараняць сябе ад віруса з дапамогай масак, то ў грамадскім транспарце многія забываюцца на гэты сродак бяспекі. Выключэнне — метро: там без маскі вас не прапусцяць праз турнікеты. Але, спусціўшыся на станцыю, многія пасажыры тут жа здымаюць маску.

А вось у аўтобусах, тралейбусах і нават маршрутках (дзе памер салона наогул не прадугледжвае магчымасці якога-небудзь дыстанцыравання) маскі, па нашых назіраннях, людзі або ўвогуле не надзяваюць, або спускаюць пад падбародак.

— У гадзіну пік я заўсёды надзяваю маску, — кажа пажылая пасажырка аўтобуса, што ідзе па праспекце Незалежнасці. — А цяпер людзей мала. Проста хачу аддыхацца, хутка ішла і запыхалася. Наогул, я стараюся быць дысцыплінаванай. Але горача, душна, пад маскай нос і падбародак чэшацца, дыхаць цяжка...

А вось малады хлопец на прыцоўцы аўтобуса якраз у масцы, і надзета яна як трэба, а не боўтаецца пад падбародкам або на адным вуху.

— На вуліцы маску не нашу (ды гэта і не патрэбна, калі ёсць магчымасць вытрымліваць сацыяльную дыстанцыю 1,5 метра). А калі заходжу кудысьці, абавязкова надзяваю маску. Гэта проста павага да людзей, этыкет нашага часу, — кажа Андрэй. — Тым больш мой старэйшы брат — урач «хуткай дапамогі», і ён настойвае, каб уся наша сям'я выконвала меры бяспекі.

— Маскі патрэбныя толькі для самазаспакаення, — перакананая маладая дзяўчына, яшчэ адна пасажырка аўтобуса. — Асабліва га сэнсу ў іх я не бачу. Надзяваю толькі таму, што абавязаная. Месцаў перадачы віруса вельмі шмат: клавіятура камп'ютара ў бібліятэцы, банкаматы, дзвярныя ручкі, поручні ў грамадскім транспарце і г. д. Ад усяго не зберажэшся.

— Асабіста я надзяваю маску, калі заходжу куды-небудзь, дзе шмат людзей. Таму што ўсё роўна страшна, хоць і не так, як было, калі вірус толькі з'явіўся, — дзеліцца меркаваннем пасажырка пажылога ўзросту. — У краму хаджу і ў грамадскім транспарце да нядаўняга часу ездзіла не толькі ў масцы, але яшчэ і ў пальчатках. Зараз вось без пальчатак: занадта горача. Але маску ўсё роўна нашу. Без выканання масачнага рэжыму ковід мы не пераможам.

Такім чынам, высновы. Месцы, дзе ў масках абсалютна ўсе наведвальнікі, — аптэкі, паліклінікі і іншыя медыцынскія ўстановы. Людзі ўпэўненыя: рызыка сустрэць крыніцу заражэння тут вышэйшая. Месцы, дзе маскі практычна не носяць, — забаўляльная сфера. Вы практычна не ўбачыце чалавека ў масцы ў кіназале падчас сеанса, у трэнажорнай зале, у кафэ або рэстаране (паводле рэкамендацый медыкаў, пры наведванні рэстаранаў і кафэ без маскі можна знаходзіцца, толькі пакуль вы ясце).

ШТО КАЖУЦЬ МЕДЫКІ

— Ва ўмовах неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыі, звязанай з распаўсюджваннем новай каранавіруснай інфекцыі ЦМVIA-19, асабліва значэнне набывае захаванне жыхарамі простых спосабаў прафілактыкі, якія дазваляюць знізіць рызыку інфіцыравання і захаваць здароўе сабе і сваім блізкім, — кажа **ўрач-тэрапеўт загадчыца аддзялення прафілактыкі УАЗ «2Н-я гарадская паліклініка» г. Мінска Галіна КУДРАВЕЦ.** — Медыцынскія маскі, якія засцерагаюць дыхальныя шляхі ад трапляння ў іх хваробатворных арганізмаў, — адзін з найбольш эфектыўных спосабаў аховы ад інфекцый і вірусаў, даступны шырокім слаям насельніцтва. Выкарыстанне сродкаў індывідуальнай аховы органаў дыхання неабходна пры наведванні крам, гандлёвых цэнтраў, аб'ектаў грамадскага харчавання (за выключэннем часу непасрэднага прыёму ежы), аптэк, установ аховы здароўя, установ адукацыі, сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, спартыўных аб'ектаў, адміністрацыйных будынкаў, аддзяленняў банкаў, сувязі, пошты, аб'ектаў бытавога абслугоўвання, установ культуры, забаўляльных цэнтраў, грамадскага транспарту. Аднаразовыя маскі, маскі з тэкстыльных матэрыялаў рэкамендавана мяняць кожныя дзве гадзіны (звязана гэта з іх увільгатненнем ў працэсе дыхання). Правільна надзетая маска павінна быць зафіксавана ў становішчы, калі цалкам, як мага больш шчыльна да скуры, прыкрыта ніжняя частка твару — і рот, і нос. Маска, якая закрывае толькі падбародак ці толькі рот, не выконвае ахоўнай функцыі!

— Ці надзяваць маску дзіцяці?

— У адпаведнасці з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, дзеці ва ўзросце пяці гадоў і маладзейшыя не павінны насіць маскі. У некаторых выпадках магчыма выкарыстанне медыцынскай маскі дзецьмі, маладзейшымі за пяць гадоў, напрыклад, калі побач з дзіцем знаходзіцца хворы. У гэтым выпадку дарослы павінен быць побач, трымаць дзіця ў полі зроку, каб кантраляваць бяспечнае выкарыстанне маскі. Дзецям ва ўзросце ад 12 гадоў рэкамендавана насіць маскі гэтак жа, як дарослым людзям,— выкарыстоўваць іх там, дзе немагчыма забяспечыць сацыяльную дыстанцыю, незалежна ад пары года.

— Ці насіць маску пасля вакцынацыі ад ковіду?

— Улічваючы, што пасля ўвядзення першай дозы вакцыны арганізму патрабуецца час для выпрацоўкі спецыфічнага імунітэту, можна заразіцца вірусам у дні пасля вакцынацыі і ў дні, якія папярэднічаюць вакцынацыі. Паўнавартасны спецыфічны імунітэт фарміруецца ў 92 % прышчэпленых праз (—21 дзень пасля ўвядзення другога кампанента вакцыны. Таму, нягледзячы на праходжанне вакцынацыі, прышчэпленым пацыентам неабходна працягваць насіць ахоўную маску, часта мыць рукі і выконваць сацыяльную дыстанцыю.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Извещение о проведении 2У июля 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе				
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Капитальное строениеГс инв. номером 500ф-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1ф, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: литер а – площадка, литер б – ограждение, литер в – железнодорожные пути	Площадь – 0,308(га, кадастровый номер – 500000000005003(10	600 000,0	60 000,0
2	Капитальное строение с инв. номером 500ф-55262 общей площадью 246,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Брест-Литовская, 4, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0436 га, кадастровый номер – 500000000004003344	145 920,0	14 500,0
3	Капитальное строение с инв. номером 500ф-60246 общей площадью 320,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Брест-Литовская, 4ф, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0449 га, кадастровый номер – 500000000004005034	135 360,0	13 500,0
4	Капитальное строение с инв. номером 630ф-65814 общей площадью 94,9 кв. м (наименование – бухгалтерия-склад, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности – кирпичная холодная пристройка, два склада-холодильника, пять дощатых сараев)Окапитальное строение с инв. номером 630ф-65813 общей площадью 122,8 кв. м (наименование – кондитерский цех, назначение – здание неустановленного назначения)Окапитальное строение с инв. номером 630ф-65811 общей площадью 15(,6 кв. м (наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)Окапитальное строение с инв. номером 630ф-65816 общей площадью 42,0 кв. м (наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное), расположенные по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 4, и капитальное строение с инв. номером 630ф-(9669 протяженностью подземной прокладки 4,10 м (наименование – водопроводные сети, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, составные части и принадлежности – здания, сооружения, оборудование согласно техническому паспорту бф от 1(.0(.2019 года, составленного по состоянию на 10.0(.2019 года), расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Вокзальная	Площадь – 0,1382 га, кадастровый номер 623850100003001899	32 659,4(	3 200,00
5	Капитальное строениеПс инв. номером 640ф-5583((общей площадью 33(,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 94А, наименование – торгово-производственный комплекс, назначение – здание многофункциональное, составные части и принадлежности – торгово-производственный комплекс А1фс двумя пристройками 1, 2, складом 3, дорожка а, дворовое покрытие б, калитка в, ворота г, забор д	Площадь – 0,2462 га, кадастровый номер 642500000001000231	329 (12,0	32 900,0
6	Капитальное строение с инв. номером 412ф-14444 общей площадью 285,1 кв. м (наименование – кирпичное одноэтажное здание магазина № 12, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – две кирпичные пристройки, терраса), капитальное строение с инв. номером 412ф-14445 общей площадью 65,4 кв. м (наименование – одноэтажное кирпичное здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), расположенные по адресу: Гродненская обл., Мостовский р-н, г. Мосты, ул. Станционная, д. 4	Площадь – 0,1505 га, кадастровый номер – 424050100005000002	4(160,0	4 (00,0
(	Капитальное строение с инвентарным номером 633ф-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский сф, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – здание бревенчатое, облицованное кирпичом	Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023	9 240,0	920,0
8	Капитальное строение с инв. номером 633ф-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский сф, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д.81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – кирпичное здание магазина, два кирпичных склада	Площадь – 0,03(9 га, кадастровый номер – 624082004601000184	11 640,0	1 100,0
9	Капитальное строение с инв. номером 240ф-28899 общей площадью 2 162,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, (1А, наименование – здание магазина № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – подвалС капитальное строение с инв. номером 240ф-29803 протяженностью 165 м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, (1, наименование – электрические сети, назначение – сооружение специализированное энергетики электрические сети к магазину № 43, составные части и принадлежности – электрические сети (участок кабеля подземного 0,4 кВВ от ТП-284 до ввода в магазин, участок кабеля подземного 0,4 кВ от ввода в здание магазина до щитовой магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от щитовой жилого дома до ввода в здание магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от ввода в здание магазина до щитовой магазина)	Площадь – 0,1949 га, кадастровый номер – 2424000000010043(6	(3 153,60	(300,0
10	Изолированное помещение)))))) с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-1(, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение	-	46 260,0	4 600,0
11	Капитальное строение с инв. номером 240ф-459(6 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский сф, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сетиС капитальное строение)))))) с инв. номером по бухгалтерскому учету 084(92 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский сфсаг. Заполье, ул. Станционная, 2ф1наименование – здание склада	Площадь – 0,03(0 га, кадастровый номер – 223684400001000005	3 653,(8	360,0
12	Капитальное строение с инв. номером 630ф-4144(общей площадью 304,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский сф, аг. Олехновичи, ул. Молодежная, д. 2, наименование – одноэтажный кирпичный магазин, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – кирпичная рампа с навесом	Площадь – 0,06(2 га, кадастровый номер – 623883004601000103	86 500,0	8 600,0
13	Капитальное строение с инв. номером 240ф-44(33, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39А, общей площадью 1422,1 кв. мСнаименование – здание склада с теневым навесомСназначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищС оставные части и принадлежности – теневой навес, площадка	Площадь – 0,4652 га кадастровый номер – 223650100001016130	109 538,4	10 900,0
14	Капитальное строение с инв. номером 240ф-44(21, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39Б, общей площадью 494,6 кв. мСнаименование – здание склада (картофелехранилище)Сназначение –здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищС оставные части и принадлежности – пристройка, забор, площадка	Площадь – 0,2102 га кадастровый номер – 223650100001016129	42 456,0	4 200,0
15	Капитальное строение с инв. номером 240ф-45933, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39В, общей площадью 64,4 кв. мСнаименование – здание склада (фруктохранилище), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищС капитальное строениеПТс инв. номером 240ф-44(24, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39Вф1общей площадью 313,1 кв. мСнаименование – здание тарного складаСназначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищС оставные части и принадлежности – ограждение, площадка	Площадь – 0,1043 га кадастровый номер – 223650100001016128	45 636,0	4 500,0
16	Капитальное строениеПТс инв. номером 110ф-1135(3, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка, отапливаемая пристройка, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения	Площадь – 0,160(га, кадастровый номер – 141000000001005239	133 200,0	13 300,0
1(	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание арочного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245	49 800,0	4 900,0
18	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(136, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф, общей площадью 209,0 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,042(га, кадастровый номер – 141000000001005219	25 260,0	2 500,0
19	Капитальное строение с инв. номером 110ф-1135(4, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф, общей площадью 466,2 кв. м, наименование – здание холодильника, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,099(га, кадастровый номер – 141000000001005218	61 200,0	6 100,0
20	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(144, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф, общей площадью 1 212,(кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216	146 400,0	14 600,0
21	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(13(, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф, общей площадью 855,6 кв. м, составные части и принадлежности: этаж подвальный, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000000100521(	102 000,0	10 200,0
22	Капитальное строение)))))) с инв. номером 110ф-14895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф0, общей площадью (3(,0 кв. м, составные части и принадлежности: навес, наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,1(53 га, кадастровый номер – 141000000001005244	88 200,0	8 800,0
23	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф1, общей площадью ((5,1 кв. м, составные части и принадлежности: этаж подвальный, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211	81 600,0	8 100,0
24	Капитальное строение с инвентарным номером 110ф-11(143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф2, общей площадью 212,(кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель	Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212	26 640,0	2 600,0
25	Капитальное строение)))))) с инвентарным номером 110ф-14896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф3, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213	25 920,0	2 500,0
26	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(142, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф4, общей площадью 291,(кв. м, наименование – здание кирпичного гаража, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)	Площадь – 0,0980 га, кадастровый номер – 141000000001005240	34 (40,0	3 (00,0
2(	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф5, общей площадью (03,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243	82 200,0	8 200,0
28	Капитальное строение с инв. номером 110ф-11(140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф6, общей площадью 22(,5 кв. м, составные части и принадлежности – этаж подвальный, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака	Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214	2(000,0	2 (00,0
29	Капитальное строение)))))) с инв. номером 110ф-11(139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20Аф(, общей площадью 31(, 2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,145(га, кадастровый номер – 141000000001005215	23 820,0	2 300,0
Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, рекомендуется осмотр				

** Ограничения (обременения): аренда до 31.07.2021 г.*
*** Ограничения (обременения): аренда до 30.06.2022 г.*
**** Ограничения (обременения): аренда до 06.10.2021 г.*
***** Ограничения (обременения): аренда до 31.12.2021 г.*
****** Ограничения (обременения): аренда до 31.03.2022 г.*
******* Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г.*
******** Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г.*

Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области» отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона:
- по предметам торгов № 1, 6–29 в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торговС
- по предмету торгов № 2, 3 в размере 1 (одного) процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торговС
- по предмету торгов № 4, 5 в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Продавец имуществаI ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, ((ф2, 220099, г. Минск.

Организатор торговI государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 41(, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов)Сзаявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов)Скопию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей)Скопию устава (для юридических лиц)Скопию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 28.07.2021 по предмету торгов № _ _.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **2Уиюля 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.0Н2021 по 2Ч.0Н2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 1(.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (01( ) 240-62-06.

Телефоны для справокI (01( ) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»)С(01( ) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

ЗМЯНІЦЬ ШКОЛУ І СЯБЕ

Чаму нават самым вопытным педагогам карысна паўдзельнічаць у праграме «Настаўнік для Беларусі»?

Ашаламляльнай аванцюрай назваў праект «Настаўнік для Беларусі» адзін з яго аўтараў і куратараў настаўнік беларускай мовы Зміцер МАКАРЧУК. Прыкладна чатыры-пяць гадоў таму ён разам са сваім сябрам настаўнікам рускай мовы і літаратуры Сяргеем БАРОДЗІЧАМ загарэліся ідэяй прывесці ў школы ў невялікіх населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых педагогаў, якія змогуць удыхнуць у іх новае жыццё. Мэтай было зрабіць якасную адукацыю даступнай для кожнага дзіцяці ў любой школе, а не толькі ў гарадской. Але, каб увасобіць сваю задуму ў жыццё, трэба было знайсці аднадумцаў, стварыць каманду. Плюс, вядома, знайсці сродкі на праект. Фінансава падтрымаць карысную ініцыятыву пагадзіўся БПС-Ашчадбанк.

Праект стартаваў два гады таму, а літаральна днямі ва ўдзельнікаў першага набору адбыўся выпускны. Менавіта так — не ў вучняў, а ў настаўнікаў быў свой выпускны вечар...

Дзевяць першапраходцаў

— Усё, што мы рабілі два апошнія гады, было для нас упершыню: і тое, як шукалі школы, гатовыя прыняць апантаных настаўнікаў, як адбіралі ўдзельнікаў, як працавалі з партнёрамі і спонсарамі. Таму, калі вам калі-небудзь выпадзе шанц паўдзельнічаць у аванцюры, смела прымайце гэты выклік, нават не задумваючыся, — параіў гасцям педагагічнага свята Зміцер Макарчук.

Для рэалізацыі праграмы «Настаўнік для Беларусі» БПС-Ашчадбанк стварыў Мясцовы адукацыйны фонд «Новая школа». Далучыцца да яго могуць любыя кампаніі-донары, якія пажадаюць зрабіць свой унёсак у развіццё якаснай адукацыі ў рэгіёнах Беларусі. Таксама БПС-Ашчадбанк заключыў з Міністэрствам адукацыі пагадненне аб супрацоўніцтве.

Старшыня праўлення фонду «Новая школа» Вера КАРАЛЁВА прызналася: на старце праграмы была рызыка, што не знойдуцца педагогі, якія адважацца прыняць выклік і выйсці з зоны камфорту.

Да ўдзелу ў праекце «Настаўнік для Беларусі» запрашаліся як новаспечаныя выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў, так і вопытныя педагогі. Першым крокам было запаўненне анкеты, затым кандыдатаў чакала скайп-інтэрв'ю, а на апошнім этапе — сумоўе ў Мінску, падчас якога трэба было таксама правесці сямі-хвілінны ўрок. Ключавымі крытэрыямі для адбору сталі камунікатыўныя навыкі кандыдатаў, іх гатоўнасць працаваць у камандзе і свядомая матывацыя (удзельнік павінен быў падзяляць каштоўнасці праекта). Усяго паступіла 60 заявак ад ахвотных змяняць школу і сябе. Далей 12 адабраных кандыдатаў чакаў месячны летні інтэнсіў. На працягу трох тыдняў як учарашнія выпускнікі, так і настаўнікі з салідным прафесійным стажам навучаліся сучасным падыходам у педагогіцы і выкладанні, загартоўвалі свае лідарскія якасці, атрымлівалі веды ў галіне праектнага менеджменту і тайм-менеджменту. Кожны дзень быў напоўнены выязнымі мерапрыемствамі і сустрэчамі з цікавымі спікерамі. А ў апошні тыдзень інтэнсіву ўсіх чакаў летнік з дзецьмі на тэму «Навыкі XXI стагоддзя», які кандыдаты павінны былі самі спланаваць. Гэта быў сапраўдны выклік не толькі для ўчарашніх выпускнікоў без вопыту работы, але і для педагогаў са стажам...

У выніку для ўдзелу ў праграме «Настаўнік для Беларусі» былі адабраныя дзевяць настаўнікаў, якія на два гады адправіліся працаваць у школы ў Кобрынскім (аграгарадок Павіцце), Бярэзінскім (Паплаўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа), Чэрвеньскім (Лядзенскі дзіцячы сад — сярэдняя школа) раёнах, у гімназію Дзяржынска і Негарэльскую сярэднюю школу № 1.

На сваім месцы

Настаўніца рускай мовы Алена АЛЕХНА стала адной з дзевяці педагогаў, якія трапілі ў першы набор праграмы «Настаўнік для Беларусі». Дзяўчына хоць і мела ўжо педагагічны досвед (працавала педагогам-арганізатарам ва ўстановах адукацыі ў Салігорску і Бабруйску), вышэйшую педагагічную адукацыю атрымала толькі ў 2019 годзе (скончыла завочна філфак БДУ).

Увогуле, усе гісторыі «настаўнікаў для Беларусі» ўражваюць і натхняюць. Адначасова міжволі задаешся пытаннем: чаму людзі змяняюць горад на вёску?

Алена Алехна прызнавалася, што яна ў праграме «Настаўнік для Беларусі» для таго, каб да канца разабрацца і зразумець, чым можа быць карысная дзецям, для таго, каб навучыцца новым методыкам, рабоце ў камандзе, набыць новыя сувязі. А яшчэ, каб навучыцца верыць у сябе. За час летняга інтэнсіву дзяўчына зразумела, што рэсурсаў у чалавека значна больш, чым ён мяркуе. Калі ты ў нешта верыш, трэба шукаць магчымасці гэта рэалізоўваць.

Пасля ўсіх этапаў адбору Алена пераехала разам з дачкой са свайго апошняга месца працы ў Салігорску ў Негарэльскую сярэднюю школу, што ў пасёлку Энергетыкаў.

— Два гады праляцелі імгненна. Сёння з упэўненасцю магу сказаць, што я на сваім месцы, — канстатуе настаўніца. — За гэты час разам з дзецьмі мы паспрабавалі сябе ў ролі журналістаў, відэааператараў і сцэнарыстаў, займаліся даследаваннямі, удзельнічалі ў праекце тэатральнага аб'яднання па інтарэсах «Праз тэатр», вучыліся працаваць у камандзе. Дзякуючы праграме я навучылася вельмі многаму, у тым ліку адстойваць сваю пазіцыю і ісці да канца ў тым, што для мяне насамрэч важна. Ведаеце, раней я заўсёды адчувала сябе нейкім самотным воінам, які хацеў больш і для людзей, і для свету ў цэлым. А тут нарэшце сустрэла аднадумцаў...

Трэба дадаць, што прыклад дачкі натхніў і маці Алены (яна таксама педагог), якая далучылася да праграмы на наступны год, калі на 25 месцаў прыйшло ўжо 130 заявак.

Глыток свежага паветра

Удзельніцамі першага набору «Настаўніка для Беларусі» сталі і дзве **Наталлі ЦЕЦЯРУК,** якія працуюць у школе ў аграгарадку Павіцце ў Кобрынскім раёне. Настаўніцы замужам за роднымі братамі. Адна з іх выкладае беларускую мову, другая працуе ў пачатковай школе. Дзве Наталлі засталіся працаваць у сваёй школе, якая падала заяўку на ўдзел у праграме «Настаўнік для Беларусі», толькі на працягу двух гадоў яны мелі пастаянную метадычную, куратарскую і фінансавую падтрымку. Дарэчы, школы, як і ўдзельнікі праграмы, таксама праходзяць адбор. Арганізатары абавязкова знаёмяцца з адміністрацыяй, педагагічным калектывам і кантэкстам, у які трапіць будучы ўдзельнік праграмы. Стараюцца стварыць і выбудаваць экалагічную камунікацыю, якая будзе камфортнай для ўсіх, каб настаўнікі прыходзілі ў атмасферу ўзаемаразумення і агульнага імкнення зрабіць шмат добрага і патрэбнага для дзяцей. Затым куратары прыязджаюць у школы ў госці, дапамагаюць з арганізацыяй розных мерапрыемстваў для вучняў і настаўнікаў, ладзяць сумесныя сустрэчы з адміністрацыямі ўсіх школ-партнёраў, дзе стараюцца пачуць адно аднаго, дапамагчы ў вырашэнні канкрэтных праблем.

— Маё рашэнне прыйсці ў праграму «Настаўнік для Беларусі» было няпростым, — прызналася **настаўніца пачатковых класаў Наталля ЦЕЦЯРУК.** — На той момант я мела ўжо 23 гады прафесійнага стажу, а трэба было перагледзець свае погляды і падыходы ў прафесіі. Давялося нават крышачку сябе ламаць. Але праграма прыўнесла ў маю прафесію глыток свежага паветра. Я даведалася шмат новага, пазнаёмілася з актыўнай ацэнкай, мае малышы пачалі працаваць у парах і групах, навучыліся дамаўляцца паміж сабой, мы пазнаёміліся з мовай праграмавання Scratch, не баяліся эксперыментаваць. Нашы ўрокі сталі цікавымі, сучаснымі і карыснымі. Таму, нават калі вы адпрацавалі ў школе дваццаць гадоў і больш, раю абавязкова паўдзельнічаць у праграме «Настаўнік для Беларусі», якая дапамагае не застыць у сваім прафесійным развіцці ды рушыць наперад.

У сакавіку ў Павіцці прайшоў кніжны анлайн-фестываль. Яго арганізатарамі і вядучымі сталі самі вучні пад кіраўніцтвам Наталлі Васілеўны і Наталлі Іванаўны Цецярук. Але на анлайн-фестывалі яны не спыніліся, вырашыўшы, што жывыя стасункі нельга нічым замяніць. Таму зладзілі і афлайн-фестываль кнігі «Пачытай у Павіцці».

Вучні пачатковых класаў сустрэліся з **Надзеяй ЯСМІНСКАЙ, вядомай беларускай пісьменніцай,** якая працуе пераважна ў жанры фэнтэзі. Разам адправіліся ў чароўную вандроўку па старонках кнігі «Мора ў чамадане». Пасля гэтага пабывалі на майстар-класе Любові Сардалішвілі «Незвычайнае чытанне — радасны настрой».

Арганізатар фестывалю «Горад і кнігі» Вольга ВОЎК правяла для школьнікаў майстар-клас па вырабе літаратурна-тактыльных паштовак. **Настаўніца гісторыі гімназіі горада Дзяржынска Ала ГАЛУБКОВІЧ,** яшчэ адна ўдзельніца першага набору праграмы «Настаўнік для Беларусі», на сваім майстар-класе «Акрылам па тканіне» дала магчымасць стварыць свой непаўторны малюнак або цытату з любімай кнігі на любімай вопратцы, а яшчэ паспрабаваць тэхніку роспісу тканіны. Завяршыўся фестываль літаратурнымі вячоркамі, падчас якіх кожны змог прачытаць свой любімы твор на роднай мове альбо праспяваць песню пад гітару.

Усе ўдзельнікі праграмы «Настаўнік для Беларусі» рэалізоўваюць праекты, арыентаваныя на развіццё мясцовай супольнасці. Такая ўмова ўдзелу ў праграме. У Павіцці гэта фэст кнігі. Ад Павіцця да ўкраінскай граніцы — усяго сем кіламетраў, а да сталіцы — 350. Калі б не гэты праект, у вучняў наўрад ці калі-небудзь з'явілася б магчымасць сустрэцца з сучаснымі пісьменнікамі...

Не спыняцца

Адна з устаноў адукацыі, якая прыняла дзвюх удзельніц праграмы — **настаўніцу гісторыі Алу ГАЛУБКОВІЧ** і **педагога-псіхолага Ксенію ГАРШКОВУ,** — гімназія Дзяржынска.

— Хоць праект яшчэ зусім малады, але ўжо можна падводзіць яго прамежкавыя вынікі. Вы ўзялі на сябе вельмі высакародную місію — зрабіць якасную школьную адукацыю даступнай для кожнага дзіцяці. І мы ганарымся, што з'яўляемся вашымі партнёрамі, — падкрэсліла ў сваім выступленні падчас «выпускнога» **дырэктар установы Людміла ПАЎХЛЕБ.** — Нашай гімназіі блізкі дух праекта «Настаўнік для Беларусі», мы таксама вітаем наватарства, ініцыятыўнасць, крэатыўнасць, не любім стаяць на месцы. Выпускнікі праекта сталі для сваіх вучняў і школ маякамі на шляху да поспеху і ў новым развіцці. І такія маякі трэба запальваць і надалей...

«Праграме «Настаўнік для Беларусі» ўсяго два гады, але пройдзены шлях, якім я ганаруся. Ганаруся нашымі настаўнікамі, іх талентамі, энтузіязмам і невычэрпнай энергіяй. Іх перамогі — гэта новыя магчымасці для дзяцей. Магчымасці, якіх магло б не з'явіцца, калі б настаўнікі не прыехалі ў сельскую школу, — кажа **дырэктар фонду «Новая школа» Таццяна КВЯЦІНСКАЯ.** — Я ўдзячная дырэктарам нашых партнёрскіх школ за тое, што яны вераць у нас, падтрымліваюць удзельнікаў, адгукаюцца на тыя ініцыятывы, якія дазваляюць іх установам выйсці на новы ўзровень развіцця. Ганаруся камандай, якая робіць гэты шлях прасцейшым, аказваючы падтрымку, але і складаней-шым, натхняючы на новыя адкрыцці. А рэалізацыя самых амбіцыйных мэт становіцца магчымай дзякуючы сумеснай дзейнасці нашых метадыстаў і куратараў. Я ўдзячная партнёрам, якіх сёлета стала больш, а гэта значыць, што тэма адукацыйнай няроўнасці не пакідае абыякавымі прагрэсіўных і думаючых людзей з бізнес-супольнасці. Удзячная нашаму заснавальніку — БПС-Ашчадбанку, які не толькі аказвае фінансавую падтрымку, але і ўключаецца ў адукацыйныя ініцыятывы. Мы не спыняемся і ўжо рыхтуемся да сустрэчы з новымі героямі!»

«Запрашаем далучацца да нашай дружнай каманды ўсіх. Нават калі вы не настаўнік, мы абавязкова знойдзем для вас занятак», — усміхаецца Зміцер Макарчук.

На сёння ў рэгіёнах краіны выкладае ўжо больш за 30 «настаўнікаў для Беларусі» (9 удзельнікаў першага набору і 22 — другога), праграма ахапіла літаральна ўсю краіну (19 школ-партнёраў) і (тысяч дзяцей.

Удзельнікі праекта атрымліваюць пастаянную падтрымку куратара і метадыста, праектную падтрымку, стыпендыю ў дадатак да асноўнага заробку ў школе, кампенсацыю на арэнду жылля, магчымасць вучыцца ў магістратуры (для ўдзельнікаў без педагагічнай адукацыі) і ноўтбук для зручнай работы.

У маі завяршыўся ўжо трэці набор у праграму «Настаўнік для Беларусі». Усяго было атрымана 108 заявак ад кандыдатаў і 34 заяўкі ад школы (гэта, між іншым, 94 адкрытыя вакансіі): у тым ліку 18 заявак ад гарадскіх школ, 8 заявак з аграгарадкоў, (заявак ад сельскіх школ і адна заяўка са школы ў абласным цэнтры. Адабраных удзельнікаў чакае летні інтэнсіў, па выніках якога і стане вядомая трэцяя каманда «настаўнікаў для Беларусі».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 22 (548)

Перад прэм'ерай

САКРЭТЫ «ДЗІКАГА ПАЛЯВАННЯ»

Напярэдадні прэм'еры оперы Уладзіміра Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха» ў Вялікім тэатры Беларусі ўспомнілі, як ствараўся першы спектакль

ТАДЫ, у канцы 1980-х гадоў, гэтая пастаноўка збірала поўныя залы, не ўсе жадаючыя маглі трапіць на спектаклі. І таму каля тэатра дзяжурыла міліцыя, у тым ліку конная. Спектакль, завязаны на беларускай гісторыі і прасякнуты нацыянальным каларытам, з поспехам ішоў і за межамі рэспублікі. Артысты згадвалі, што публіка «шалела», і звесткі пра шыкоўныя прэм'еры разляталіся сярод аматараў тэатральнага мастацтва. Так, калі ў Маскве, на наступны дзень пасля паказу ў Вялікім тэатры, вырашана было даць яшчэ адзін незапланаваны спектакль, вялізная зала была запоўнена.

За ўсю гісторыю беларускай оперы ні адзін айчынны спекталь не пратрымаўся так доўга: «Дзікае паляванне» ішло больш за 20 гадоў! Оперу нават ставілі пад адкрытым небам у Траецкім прадмесці, задзейнічалі ў пастаноўцы жывых коней. Гледачы, якія тады сядзелі на траве і сачылі за спектаклем, да гэтага часу ўспамінаюць яго энергетыку, тыя дрыжыкі, што ішлі па скуры, калі яны паглыбляліся ў містыку гістарычнага дэтэктыва Уладзіміра Караткевіча.

Але і сам працэс стварэння спектакля стаў з'явай. Ён нараджаўся ў час супрацоўніцтва выбітных асоб.

— Мяне моцна ўражвалі творы Караткевіча. Быў 1984-ы, тады наш калектыў знаходзіўся на гастролях у Маскве ў Вялікім тэатры, і я думаў, што пасля вяртання знайду, як пазнаёміцца з пісьменнікам. Але падчас гэтых гастроляў класіка не стала. Я стаў перачытваць яго збор. Уздзеянне літаратуры было каласальнае, і я вырашыў, што сюжэт павінен стаць операй, — згадвае **першы выканаўца партыі Беларэцкага, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, мастацкі кіраўнік «Беларускай капэлы» Віктар СКАРАБАГАТАЎ.**

З гэтай ідэяй ён звярнуўся да свайго сябра кампазітара Уладзіміра Солтана. Аказалася, што таго таксама зачапіла «Дзікае паляванне караля Стаха», і ён задумаў сімфанічную паэму і нават найграў на раялі некалькі фрагментаў — вальс і музыку пагоні. Вось толькі Віктар Скарабагатаў тады пераканаў Солтана, што ствараць трэба оперу. Далей сябры пачалі шукаць іншых спецыялістаў для ажыццяўлення ідэі. Падключылі Святлану Клімковіч, якая стварыла лібрэта для оперы, і дырыжора Яраслава Вошчака.

Яраслаў Антонавіч спачатку заўважыў, што яму трэба ўважліва перачытаць твор Караткевіча, а праз пару дзён пацвердзіў, што сюжэт тут, безумоўна, оперны. Праца закіпела, да каманды далучыўся адзін з найлепшых на той час у Савецкім Саюзе сцэнографаў Эрнст Гейдэбрэхт. Мастак разам з Яраславам Вошчакам ездзілі па ўсёй Беларусі, глядзелі замкі, якія тады былі не ў лепшым стане.

— Праз месяц Эрнст Гейдэбрэхт паказаў эскізы будучых дэкарацый. Калі я іх пабачыў, зразумеў, што спектакль адбыўся, — настолькі гэта былі цудоўныя, бліскучыя работы, — успамінае Віктар Скарабагатаў. — Вядома, можна сказаць, што сённяшні тэатр зусім не тое, цяпер іншы тэхнічны ўзровень, але па тых часах дэкарацыі былі геніяльныя.

Яраслаў Вошчак працягваў працу, нават калі цяжка хварэў. Яго прывозілі на рэпетыцыі з бальніцы, і жонка дырыжора казала, што пастаноўка «Дзікага палявання» трымала яе мужа на гэтым свеце лепш, чым лекі. І, тым не менш, за месяц да прэм'еры Яраслава Антонавіча не стала. Амаль аднагалосна калектыў пагадзіўся, што на дапамогу трэба выклікаць дырыжора Аляксандра Анісімава, які на той час працаваў у Пярмі.

— Мая кар'ера тады паспяхова складвалася, работа была вельмі цікавай, але сэрца часам балела, што я далёка ад сваёй другой радзімы (нарадзіўся я ў Маскве, пасля жыў у Беларусі). І тут да мяне з Мінска прыязджаюць ганцы, сур'ёзныя, аўтарытэтныя музыканты, — расказвае **Аляксандр АНІСІМАЎ.** — Яны прапануюць пазнаёміцца з операй і вырашыць, ці гатовы ўзяць на сябе кіраўніцтва работай, якая ў поўным разгары. Калі сыграліпартытуру, я ўлюбіўся ў гэтую музыку. Калі дакранаўся да старонак, думаў, што да іх дакранаўся Вошчак, што ён удыхнуў у партытуру многа асабістага, але я таксама рабіў свой унёсак. На мой погляд, у нас атрымаўся вельмі моцны спектакль. І справа тут не ў эфектнасці, а ў глыбіні, пасылах на публіку. Галоўная ўдача сыходзіла і ад таго, што было на сцэне, немагчыма забыць работу артыстаў, аркестра, успамінаюцца народныя інструменты, як шукалі іх. Глыбокая эмацыянальнасць сюжэта і матэрыялу неверагодна хвалявала публіку. Ад музыкі ішло здароўе нацыі, людзей, іх талент».

Аляксандр Міхайлавіч упэўнены, што падобныя оперы абавязкова павінны быць у рэпертуары тэатра, і згадаў яшчэ адну работу Солтана — оперу «Пані Ядвіга», якая вартая ўвагі не менш за «Дзікае паляванне караля Стаха».

— Лічу вялікай удачай, што трапіла ў такую пастановачную групу, — прызнаецца выканаўца партыі Надзеі Яноўскай **заслужаная артыстка Беларусі Тамара ГЛАГОЛЕВА.** — Гэта быў цікавы творчы і жыццёвы вопыт. Я назірала за працай калектыву, было цікава, як робяць вобразы, якія ўзаемаадносіны падчас работы і пасля яе.

Беларэцкі — В. Скарабагатаў.

Рыгор — Я. Пятроў.

Першы выканаўца партыі Дубатоўкі, народны артыст Беларусі Уладзімір Экнадыёсаў.

Гэты спектакль адыграў яшчэ адну важную ролю: ён прымусіў задумацца аб самаідэнтычнасці, ганарыцца ўласнымі здабыткамі. Першы выканаўца партыі Дубатоўкі, народны артыст Беларусі Уладзімір Экнадыёсаў, згадваў, што да таго артысты спяваліна розных мовах свету, а спяваць па-беларуску ніхто не хацеў. З імі трэба было адпрацоўваць вымаўленне. А тут сама тэма задавала беларускасць. Работа акцёраў рабілася не на тым, што людзі хацелі паказаць свае ўнікальныя вакальныя магчымасці, — тут ішла праца ад душы, моцна адбіваўся сюжэт, артысты шукалі свае «разынкі», каб зрабіць герояў, у якіх паверацъ, перадаць гістарычнасць. Многія на той час ужо маглі самі нешта ствараць, прапаноўваць, і рэжысёр Вячаслаў Цюпа не перашкаджаў гэтым пошукам. У тэатры проста гарэлі гэтым, вельмі чакалі спектакля...

Натуральна, паўтарыць тую легендарную пастаноўку неверагодна цяжка, хоць, як паведаміў Віктар Скарабагатаў, удалося цалкам аднавіць сапраўдны аўтарскі клавір. Але яшчэ можна стварыць столькі цудоўных беларускіх рэчаў, бо не бывае неталенавітых нацый.

І новая пастаноўка, прэм'ера якой прызначана на 11 ліпеня і якой у верасні мяркуюць адкрываць новы сезон, абяцаюць, будзе гэтаксама прасякнута беларускасцю, містыкай і дабром.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота з архіва Вялікага тэатра Беларусі.

Вернісаж

ПРЫМРОІЦЦА Ж ЛЕТАМ...

Выявы, якія нібыта лінуліся на карціну і рухаюцца ў ёй, — менавіта так успрымаюцца акварэлі Дзмітрыя Сурыновіча, што склалі экспазіцыю «Маленькай летняй выстаўкі» ў сталічнай галерэі «ДК». Іх немагчыма разабраць на складнікі, а ўсе разам яны злучаюцца ў прасторы, узводзячы ў абсалют крохкую прыгажосць жыцця.

Настрой фантастычны: яго задае акварэль, ад якой, здаецца, не чакаеш адкрыццяў. Ведаеш, якой тонкай і капрызлівай яна можа быць. І пры гэтым так жа лёгка пераўтварае, падпарадкоўвае сваёй волі бялюткасць паперы — здаецца, тая толькі і чакала напоўненасці. Зразумела, што гэта была воля майстра — мастака Дзмітрыя Сурыновіча, які валодае рознымі мастацкімі тэхнікамі і дэманструе гэта на сваіх выстаўках. Мастацтва для яго — больш чым праца: дапамагло аднавіцца пасля складанай хваробы. Але найперш Сурыновіч вядомы па працы ў беларускай анімацыі.

Як мастак-пастаноўшчык ён спрычыніўся да стварэння шыкоўных айчынных анімацыйных фільмаў («Меч», «Легенда пра лэдзі Гадзіву», «Не забі. Шостая запаведзь Маісея», «Казкі старога піяніна. Сяргей Пракоф'еў», «Казкі старога піяніна. Шапэн», «Чароўная жалейка» ды інш.). Увасабляў на экране самых розных персанажаў, дарыў ім душу — і яны жылі. Але гэта на экране, дзе можна стварыць рух.

Зусім іншае — абмежаваная памерам і рамкай карціна, дзе адбіліся вобразы з жыцця. Заспетыя позіркам. Адлюстраваныя аднойчы і назаўсёды. Які тут можа быць рух? Але ж ёсць яго выразнае ўяўленне! Яго стварае менавіта акварэль — праз плыткасць, нясцэўнасць імгнення і экспрэсію, зададзеную абранымі колерамі. Усё разам стварае адчуванне рухомасці вобразаў ды сюжэтаў. І гэта яшчэ адна асаблівасць выстаўкі. Яна сапраўды летняя па настроі: хочацца назіраць за персанажамі, унікнуць у іх гісторыі і сачыць за развіццём. Бо вобразы не застылыя, а разняволена-імпульсіўныя, да захаплення — жанчыны, іх асаблівы свет. Ён і вытанчаны, і насычаны справамі. Рамантычны і пачалавечы клапатлівы. У ім ёсць месца іроніі і ўзнёсласці. У гэтым свеце складана з пэўнасцю, таму яму вельмі пасуе акварэль. Мастак гэта здолеў перадаць у вобразах-мроях, праз якія па творах расцякаецца святло. Сонечнае, летняе.



Дзе я такое бачыла? Калісьці ў дзяцінстве, падабраўшы бліскучы на сонцы кавалачак шкла, аглядалі праз яго наваколле — дамы, дрэвы, людзей навокал. Выява быццам бы расплывалася, але гэта яшчэ выразней падкрэслівала яе непаўторнасць, надавала велічы. Шкло насамрэч не маніла: яно зіхацела тады, калі ўнутранае святло рэчаў, з'яў, людзей стрымлівала прыродная сціпласць. А тое, што тады прымроілася, потым стала часткай любові да чалавечага свету. Яго ўспрыманне можа стаць прыглушаным з часам. Але калі знайсці кавалачак шкла, то зноў разумееш: ён варты захаплення. Такім жа зіхатлівым шклом стала вось гэтая «Маленькая летняя выстаўка», якая працуе да сярэдзіны ліпеня. Магчымасць акумуляваць святло, якое сціпла растварылася ў прасторы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«НЯМІГА-17» ЗАПРАШАЕ

Гэтая выстаўка ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва» прыкметная тым, што дэманструе работы мастакоў ужо неіснуючага сёння аб'яднання, але вельмі значнага для сучаснага мастацтва Беларусі

ТРЫЦЦАЦЬ пяць гадоў таму нарадзілася «Няміга-1(». Група творцаў выбрала для свайго згуртавання назву ракі, на берагах якой у 106(годзе адбылася гістарычная бітва між дружынамі полацкага і кіеўскага князёў. Гэтым заснавальнікі імкнуліся падкрэсліць сваю сувязь з каранямі нацыянальнай гісторыі і культуры. Сёння іх работы захоўваюць Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў, прыватныя калекцыі многіх краін. У час заснавання творчага аб'яднання мастакі абралі для сябе курс, які не супадаў з афіцыйнай філасофіяй мастацтва, але быў запатрабаваны часам. Згуртаванне неўзабаве стала папулярным і вызначаецца цяпер як знакавае для таго складанага пераломнага перыяду, яно зрабіла важкі ўклад у беларускае мастацтва XX—XXI стагоддзяў.

Наведвальнікі выставы маюць магчымасць убачыць у адзінай экспазіцыі творы выбітных айчынных майстроў: Галіны Гаравой, Тамары Сакаловай, Альгерда Малішэўскага, Алеся Цыркунова, Міколы Бушчыка, Сяргея Кірушчанкі, Леаніда Хобатава, Анатоля Кузняцова. Яны ў час стварэння аб'яднання не прынялі артадаксальнага разумення рэалізму і шукалі сваё месца ў кантэксце мастацтва, імкнучыся аднавіць творчы пошук айчынных мастакоў 1920-х гадоў. Гэтыя майстры стваралі падмурак, які з часам узмацнілі новыя ўдзельнікі «Нямігі-1(». Два дзесяцігоддзі таму творчае аб'яднанне спыніла сваё існаванне, але пакінула на глебе беларускага мастацтва выдатнае творчае насенне.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Пошукі генія ў вёсцы Каптаруны

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь выстаўляецца мастацкі фотапраект «Genius loci. Genius lost / Геній месца. Геній згубленасці»

Зыходным пунктам гэтага праекта стаў творчы плэнер у арт-вёсцы Каптаруны. Яна знаходзіцца на беларуска-літоўскай мяжы, а таксама на мяжы трох беларускіх абласцей. І гістарычна ўключае ў сябе культуры чатырох народаў! беларускую, літоўскую, польскую і яўрэйскую. Такім чынам, Каптаруны — свайго роду мост культур. Тут праходзіць шмат мерапрыемстваў і фестываляў.

Але вёска адметная не толькі культурнай і гістарычнай асновай — гэта яшчэ і цікавыя прырода і ландшафт. Фатографы спрабавалі адкрыць для сябе нешта новае і іншае, убачыць месца з іншага боку, знайсці сябе. Растварыцца ў месцы, прасякнуцца яго атмасферай, адчуць сабе часткай гэтай вёскі.

Ды «геній месца» аказаўся каварны. Ландшафт пачаў зацягваць, адкрывацца і адштурхоўваць. Ён прымушаў узірацца ў далягляд і шукаць новыя кропкі ўваходу. Ён не адпускаў. Каптаруны як месца збянтэжанасці, згубленасці сябе і спасціжэння пачалі «разрастацца» і ўзнікаць у новых мясцінах, краявідах, гарадах — не толькі беларускіх. Каптаруны пераўтварыліся ў персанальны выклік, на які мусіш адказаць у пэўны момант часу.

У праекце ўдзельнічалі Яўген Атцецкі, Аксана Веніямінава, Жанна Гладко, Андрэй Дубінін, Вольга Кірылава, Сяргей Лескець, Сяржук Мядзведзеў, Ігар Саўчанка, Вольга Хахлова, Аляксей Яршэвіч. Куратарка праекта — Дзіна Даніловіч.

Сама выстава створана вельмі канцэптуальна. Для яе быў выдзелены ўвесь другі паверх, амаль што для кожнага фатографа ёсць уласны пакой, дзе ён змог размясціць сваю работу так, як ён яе разумее і адчувае. Тут можна было знайсці і маленькія фотаздымкі, і фотаздымак на ўсю сцяну, дзесьці было гукавое суправаджэнне, дзесьці — відэапрайгравальнік, была нават работа з гіпаксіднай смалы.

— Вялікае бачыцца на пэўнай адлегласці — толькі так можна заўважыць маштаб і агульныя рысы — як з'явы, так і аб'екта.

Адначасова дыстанцыя з'яўляецца бар'ерам для назіральніка. Дазваляе бачыць толькі фасад — шырму, за якой хаваецца сутнасць аб'екта. Набліжэнне, канцэнтрацыя, фокус увагі — гэтыя метады дазваляюць дакладна ідэнтыфікаваць дэталі, унутраныя механікі, зазірнуць за мяжу вонкавага. Аднак яны непазбежна звужаюць погляд назіральніка, робячы яго выбарачным і суб'ектыўным, — лічыць Андрэй Дубінін.

І хоць усе гэтыя фатографы прысутнічалі на адным і тым жа плэнеры, можна лёгка ўбачыць, як па-рознаму яны правялі свой час. Гэта яшчэ раз нагадвае аб індывідуальнасці кожнага чалавека. Увогуле, розныя сэнсы і думкі ўкладзены ў фотаздымкі.

Пры ўваходзе ў пакоі ёсць магчымасць прачытаць назву калекцыі фотаздымкаў фатографа і галоўную ідэю работы.

Таксама 21, 22, 28 і 29 ліпеня ў 18.30 адбудуцца экскурсіі з кураторкай і аўтарамі праекта «Геній месца. Геній згубленасці», якія раскажуць пра яго больш падрабязна.

Наталля ДРАЗДОВА.

«ЗВЯЗДЗЕ» НІКОЛІ НЕ ЗДРАДЖУ!»

Франя Рыгораўна ЛАПАЦЕНТАВА (у дзявоцтве Канапелька) з Віцебска сябруе з найстарэйшай дзяржаўнай беларускамоўнай газетай з 1ШУ0-х гадоў. Безумоўна, кожны, хто чытае «Звязду», — наш аднадумца і дарагі нам чалавек. А такія людзі, як гэтая віцябчанка, якія са «Звяздой» надзвычай доўга, — сведчанне таго, што выданне становіцца часткай жыцця не толькі краіны, але і яе людзей.

НЕ ПАМЯТАЕ ДАТУ НАРАДЖЭННЯ

Пазнаёміўся аўтар гэтых радкоў з паважанай Франяй Рыгораўнай дзякуючы дапамозе супрацоўнікаў Віцебскага філіяла РУП «Белпошта», гарадскога аддзялення паштовай сувязі № 38. Яно знаходзіцца на праспекце Перамогі, недалёка ад дзвюх ВНУ. Разам мы і адправіліся ў госці да адданага чытача нашай газеты. Сустрэлі нас з паштальёнам ветэран падпісной кампаніі «Звязды» і яе старэйшая дачка Алена.

У пачатку размовы нечакана высветлілася, што паважаная чытачка не памятае, калі насамрэч нарадзілася.

— Адправілі ў канцлагер (нямецкія акупанты падчас Вялікай Айчыннай вайны. — **«Зв.»**). Пасведчанне аб нараджэнні было страчана. Калі вярнулася, напісалі, што нарадзілася 1 студзеня 1933 года, таму што выглядала гадоў на дванаццаць, — тлумачыць пенсіянерка.

Арыштавалі дзяўчынку, яе брата Аркадзя (старэйшы яе на тры гады), маці і бацьку фашысты з-за таго, што брат — 15-гадовы Міша — партызаніў. Яшчэ адзін, самы старэйшы, брат Жора ваяваў. Усяго ў сям'і было чацвёра дзяцей. Бацькі ў канцлагеры загінулі.

ПРАЙШЛА ПРАЗ ПЕКЛА

— Спачатку я з сям'ёй была ў перасыльным лагеры на ўскраіне Віцебска. Там нямала людзей памерла ад голаду, хвароб, холаду, бо спалі літаральна пад адкрытым небам. Потым нас павезлі на цягніку. Прывезлі на станцыю Люблін, каб пасяліць у канцлагеры Майданэк. Сустрэлі нас немцы з аўчаркамі. Мужчын — у бок, дзяцей у мацярок спачатку не забіралі, потым зрабілі гэта, — распавядае віцябчанка. — Спалі дзеці ўтрох на адных нарах.

Потым наша чытачка трапіла ў канцлагер Дахау на тэрыторыі Германіі. Там прымушалі працаваць на заводзе, які выпрацоўваў ваенныя самалёты. Дзеці цягалі вялікія дэталі, а калі не маглі іх падняць, немцы білі дзяцей бізуном. Ні ежы нармальнай, ні вады дастаткова. Калодкі на нагах драўляныя, абутак забралі яшчэ ў Польшчы.

— І кроў бралі, дык так многа: пакуль не звалішся без прытомнасці, а некаторыя ад гэтага паміралі, не дапаўзалі да барака. А яшчэ над намі медыцынскія доследы праводзілі. У прыватнасці, уколы рабілі, а потым даследавалі, як арганізм дзіцяці рэагуе, — працягвае трагічны аповед Франя Рыгораўна.

ВЫЗВАЛЕНАЯ АМЕРЫКАНЦАМІ

Канцлагер знаходзіўся на беразе ракі Эльбы. Амерыканцы вызвалілі яго ў канцы красавіка 1945 года.

— Аднойчы неяк ціха стала. Ні сабак, ні немцаў... Хлопчыкі, якія смялейшыя, вылезлі з-за барачных сцен і ўбачылі ваенных у невядомай форме. І гаварылі яны не па-нямецку і не паруску, — згадвае жанчына.

Франя тады ўпершыню ўбачыла афраамерыканцаў. Разам з сяброўкамі з лагера яны гулялі па беразе Эльбы, а тут раптам чарнаскурыя людзі з кустоўя выйшлі...

— Бягуць за намі і нешта крычаць (*смяецца*). Яны хацелі пачаставаць нас цукеркамі і яшчэ чымсьці. А мы спужаліся не на жарт! Вельмі добра адносіліся да нас амерыканцы. Мы размаўлялі з імі пры дапамозе перакладчыкаў, якіх было дастаткова.

Амерыканцы ахоўвалі дзяцей, калі яны выходзілі за тэрыторыю канцлагера. Да канца лета Франя заставалася на чужыне. За гэты час дзяцей адмылі, падлячылі, аказалі псіхалагічную дапамогу.

БЫЛА ПІЯНЕРВАЖАТАЙ

На радзіму яе везлі па лініі Чырвонага Крыжа на цягніку ў суправаджэнні ваенных.

— Па дарозе палякі падбягалі да вагонаў і частавалі дзяцей малаком, булкамі, ягадамі, — працягвае наша чытачка.

Яна прыехала ў БССР толькі ў жніўні 1945-га. Спачатку была ў дзіцячым доме ў Маладзечне. Потым у Паставах. Там шэфамі сталі ваенныя. З цеплынёй успамінае і цяпер іх увагу, дабрыню і салодкія падарункі. Пазней перавялі ў Будслаў, і туды, дарэчы, з Пастаў людзі ў форме прыязджалі наведаць сваіх юных сяброў.

Як учора, перад яе вачыма будслаўскі касцёл. Гаворыць, што ўразіла яго прыгажосць на ўсё жыццё.

Потым быў дзіцячы дом на Міншчыне — у вёсцы Даўгінава Вілейскага раёна. Пасля сёмага класа ў іншай установе для сірот папрацавала піянерважатай — у вёсцы Цярэшкі Крывіцкага раёна.

Спрабавала паступіць у Бабруйскі тэхнікум, дзе вучылі для працы ў санстанцыі. Сказалі, возьмуць, але без стыпендыі. А як жа падлетку жыць, калі ніхто не дапаможа грашыма?

У 1953-м вырашыла паехаць у Віцебск, дзе жылі яе браты. Усе цудам засталіся ў жывых, але здароўе ў кожнага было слабым. Аркадзь, які быў з ёй у канцлагеры, працаваў слесарам на дрэваапрацоўчым прадпрыемстве. Пры гэтым каля трыццаці пяці гадоў быў начальнікам летніка. Быў на добрым рахунку ў Міністэрстве адукацыі, бо арганізаваў працу выдатна. Жора працаваў счэпшчыкам вагонаў на чыгунцы. А Міша — электрыкам на дывановым камбінаце.

Дзяўчына працавала рабочай на прадпрыемстве, дзе шылі адзенне. Гаворыць, калі б не вайна, не канцлагер, мо, трапіла б у ВНУ. Напэўна, была б педагогам, бо добра ёй удавалася знаходзіць агульную мову з рознымі людзьмі. Лічыць, што менавіта канцлагернае мінулае паставіла крыж у магчымай кар'еры яе і многіх такіх, як яна.

З ГАЗЕТАЙ НАЗАЎСЁДЫ

Са сваім будучым мужам Франя пазнаёмілася ў інтэрнаце, калі працавала на дрэваапрацоўчым камбінаце. Ён скончыў Мінскі лесатэхнічны інстытут. Быў на розных пасадах, а да пенсіі доўгі час галоўным інжынерам мэблевай фабрыкі.

— Дарэчы, яны выраблялі нешта нават для крамлёўскіх інтэр'ераў, — з гонарам распавядае ўдава.

Паказала мне фота з сямейнага альбома. Там ёсць і картка, дзе яна ўжо як ветэран працы ў гасцях у былых калег. Жанчына падкрэслівае, што вельмі ўдзячна ім за тое, што не забываюць. Запрашаюць на святы, нават на аўтамабілі прывозяць туды і дамоў.

Наконт крыўды на немцаў... Цяжкае пытанне. І можна шмат кропак пісаць пасля амаль кожнага слова. Былая вязніца распаўляла, што, акрамя фінансавых выплат у якасці кампенсацыі некалькі разоў за кошт аднаго з нямецкіх фондаў была ў медыцынскіх рэабілітацыйных установах, у прыватнасці ў Польшчы, у шпіталі. Тады, дарэчы, арганізавалі экскурсію ў месца, дзе яна была вязнем.

— Там музей. Кветак шмат людзі прыносяць. А мне стала дрэнна ад таго, што ўспомніла пах крэматорыя... Літаральна ў горле быў смак горычы, калі нас, былых зняволеных, прывезлі да варот канцлагера.

Ну, зноў жа... Што б мы ні абмяркоўвалі з даўняй падпісчыцай газеты, міжвольна тэма яе жудаснага мінулага вярталася.

Жанчына была вельмі рада гонару атрымаць у падарунак ад нашай рэдакцыі кнігу, прысвечаную гісторыі выдання. Сказала, што любіць чытаць. А «Звязду» чытае вось ужо каля сарака гадоў. Муж у 1980-я ў шапіку ўбачыў газету на беларускай мове. Купіў. Спадабалася. І вось ужо колькі гадоў «Звязда» — іх сямейная газета.

— Падабаецца, як піша Валянціна Доўнар, ды вы ўсе — малайцы! — падзякавала Франя Рыгораўна.

Дарэчы, вельмі ўважліва чытае гараскоп стрыжак.

Паабяцала выпісваць газету мінімум да 2033 года. Убачыўшы маё здзіўленне, пажартавала, што менавіта такая лічба ўказана ў яе пашпарце, — да гэтага года ён сапраўдны.

Яе дочкі таксама прыхільніцы газеты. Алена, якая жыве з маці, ужо на пенсіі, але па-ранейшаму выкладае матэматыку ў СШ № 31. Другая дачка працуе спецыялістам у банку.

Вельмі любяць «звяздоўскія» календары. Для гэтай сям'і «Звязда» насамрэч родная газета на роднай мове!

Аляксандр ПУКШАНСКІ,
фота аўтара.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1I изолированное помещение, инв. № 431Р-3УШЩ(назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина с стеклоприемным пунктом), общей площадью 100,0 кв. м, расположенное по адресуI г. п. Кореличи, ул. Чехова, Ў
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355100001001622, площадью 0,0354 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Чехова, 5. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код 5.1, площадью 0,000(га
Начальная цена продажи – 8 093,42 руб. (восемь тысяч девяносто три рубля сорок две копейки) с учетом НДС
Сумма задатка – 809 руб. (восемьсот девять рублей)
Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Кореличский филиал), 231430, г. п. Кореличи, ул. У Марта, 2У, тел. У-01ЎШН-2-14-У4
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 20Ш, тел. ЎЎ-УН-Н0
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер рф для перечисления задатка – BY44B4BB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка B4BBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 21 июля 2021 г. в 11.00 по адресуI Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 20У
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https:dgrino.bydaukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.01.2020 г.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресуI г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 20У, с У.30 до 1Н.30 (понедельник – четверг) и с У.30 до 1Ч.30 (пятница)
Последний день приема заявлений – 1Ш июля 2021 г. до 1Ў.00

Телефон для справок ЎЎ-УН-НІ –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
httpsIRgrino.byRaukcion

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1I капитальное строение с инвентарным номером 442Р-Ч23Н (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Универсам»), общей площадью 3Ў1,1 кв. м, расположенное по адресуI г. Островец, ул. Физкультурная, 2ША.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 4246551000010014455, площадью 0,05(8 га (назначение – земельный участок для размещений объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина)), расположенном по адресу: г. Островец, ул. Физкультурная, 29А.
Начальная цена продажи лота – 230 000 руб. (двести тридцать тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 23 000 руб. (двадцать три тысячи рублей)
Условия проведения аукциона – аукцион без условий
Продавец – Островецкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231201, г. Островец, ул. Ленинская, 12, тел. У-01ЎШ-2УЧ-Н2
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 20Ш, тел. ЎЎ-УН-Н0
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер рф для перечисления задатка – BY44B4BB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка B4BBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 10 августа 2021 г. в 11.00 по адресуI Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 20Ш
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона httpsIRgrino.byRaukcion
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресуI г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с У.30 до 1Н.30 (понедельник – четверг) и с У.30 до 1Ч.30 (пятница). Обед — с 12.30 до 13.1У
Последний день приема заявлений – 0Ч августа 2021 г. до 1Ў.00

Телефон для справок ЎЎ-УН-НІ –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
httpsIRgrino.byRaukcion

Объявление о реализации недвижимого имущества ООО «Карпович» первые повторные торги

Организатор торгов	ЧУП по оказанию услуг «ОтельИнвест» Адрес: 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 141ф0, комн. 4 O-mai l:I otel_i nvË mai lru
Продавец	ООО «Карпович», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1, комн. 105, УНП 100146(53
Форма, время, дата и место проведения торгов	Первые повторные торги в форме открытого аукциона **состоятся 2Н июля 2021 года в 10.00** по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 141, кабинет 344
Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ними	Изолированное помещение с инв. № 500ф3-6(122(. Наименование – помещение общественного питания. Назначение – помещение общественного питанияС Общая площадь 826,3 кв. м Адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5ф-105. Начальная цена – 1 841 400,00 бел. руб. Ознакомиться с предметами лота можно с 11-16 в рабочее время предварительно позвонив по тел. ь3(5291035050
Порядок проведения торгов	Сумма шага: 5 %. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов
Размер задатка для участия	Задаток – 9 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на рф BY34B: SB30121045540169330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», B3L- B: SBBY2X, УНП 100146(53 Получатель – ООО «Карпович»
Сроки и место приема заявок на участие в торгах	Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и до 23 июля 2021 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, проспект Победителей, 141, кабинет 344. O-mai l:I otel_i nvË mai lru
Порядок заключения договора	Все расходы по переоформлению имущества возлагается на покупателя. Победитель торгов оплачивает расходы по организации торгов, которые понесло ЧУП «ОтельИнвест», в размере 80 рублей за организацию на следующие реквизиты: рф BY4(B4XB301200000(4501000933 код банка B4XBBY2X в ОАО «БНБ-Банк», УНП 192185481. Заключение договора купли-продажи осуществляется по согласованию с регистратором РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об эмиссии жилищных облигаций шестого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «СЕТКО РЭЗІДЭНШЛ»С сокращенное – ТАА «СЕТКО РЭЗІДЭНШЛ»С

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» (далее — Эмитент)Ссокращенное – ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ».

2. Место нахождения (юридический адрес): Республика Беларусь, 220062, г. Минск, ул. Ратомская, дом 48, помещение 2, помещение 2-2, телефон: 8 (01( ) 3(3-18-13, факс: 8 (01( ) 2(0-60-00Сэлектронный адрес (e-mail): setko_residentialË bnk-estate.by. Почтовый адрес: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 5, офис 4(05.

Эмитент не имеет официального сайта в глобальной компьютерной сети Интернет.

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом (далее – Мингорисполком) 10 июля 2020 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 19282((31.

Эмитент создан в результате реорганизации ООО «Сетко интернешнл» в форме выделения. Эмитент является правопреемником ООО «Сетко интернешнл» по выделенным обязательствам согласно разделительному балансу. С момента государственной регистрации Эмитента, созданного в результате реорганизации ООО «Сетко интернешнл» в форме выделения, у Эмитента возникает право собственности на имущество, активы, переданные ему по разделительному балансу.

4. Основной вид деятельности Эмитента – реализация проектов, связанных со строительством зданий.

5. Решение о шестом выпуске жилищных облигаций принято и утверждено Общим собранием участников Эмитента, протокол № 03-05ф2021 эм от 14 мая 2021 года.

6. Денежные средства при размещении жилищных облигаций настоящего выпуска уплачиваются в порядке, установленном законодательством, в безналичной форме, в белорусских рублях, на расчетный счет Эмитента № BY29: 8ЦВ30120634391010000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ № 100, БИК : 8ЦВBY2X.

(. Депозитарием Эмитента является профессиональный участник рынка ценных бумаг ЗАО «ЛИДЕРИНВЕСТ»: зарегистрирован Мингорисполкомом 19 марта 2014 г. за номером 190304686Сспециальное разрешение (лицензия) № 02200ф5200-124-115(на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданное Министерством финансов Республики БеларусьСместо нахождения: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Янки Мавра, д. 41 комн. 512, пом. 4С телефонффакс: ь3(5 (1( ) 2 21(21(С электронный адрес (e-mail): postË leader.by.

8. Облигации шестого выпуска – жилищные, именные, бездокументарные (в виде записей на счетах), бездоходные, конвертируемые.

Объем выпуска – 2 1(5 000 (два миллиона сто семьдесят пять тысяч) белорусских рублей.

Количество – (50 (семьсот пятьдесят) штук.

Номинальная стоимость облигации – **2 Ш00 (две тысячи девятьсот)** белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения в жилом доме № 1.1 в составе объекта «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения по ул.Тимирязева в г. Минске» 1-я очередь строительства (далее – Объект строительства).

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

9. Целью эмиссии жилищных облигаций (далее по тексту – совокупно именуемые «Облигации», по отдельности – «Облигация») является привлечение денежных средств юридических и (или) физических лиц, резидентов и (или) нерезидентов Республики Беларусь, в первую очередь, для строительства жилого дома № 1.1 в составе Объекта строительства (далее – Жилой дом), объектов инфраструктуры (в том числе конструкций, инженерных сетей, сооружений, благоустройства, необходимых для функционирования Жилого дома), для финансирования хозяйственной деятельности Эмитента, связанной с выполнением функций заказчика, а во вторую очередь – для пополнения оборотных средств Эмитента, в том числе возмещения ранее понесенных затрат на строительство, с возможностью временного размещения привлекаемых денежных средств в банковские вклады (депозиты). Привлеченные путем эмиссии Облигаций денежные средства будут использованы в соответствии с целью их эмиссии.

Проектная документация на Жилой дом утверждена приказом директора ООО «Сетко интернешнл» № 10 от 02.12.2019 г., имеется положительное заключение государственной экспертизы архитектурного проекта – Экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» № 643-15ф9 от 29.11.2019 г.

Жилой дом запроектирован 3-секционным, на (5 квартир, с 4 жилыми этажами в секции 1 и с 5 жилыми этажами в секциях 2 и 3, со встроенными помещениями общественного назначения и гаражом-стоянкой. Здание 4образной формы. Кровля – плоская рулонная с организованным внутренним водостоком. На отметке -3,600 размещается гараж-стоянка на 29 мфмест, место хранения велосипедов, технические помещения для обслуживания здания. Запроектированная в торце секции 3 одноэтажная пристройка и встроенные помещения первого этажа секций 2, 3 предназначены для размещения помещений социально-общественного и торгового назначения.

Общая площадь жилого здания составляет (191,52 м², в том числе общая площадь квартир – 6 0(8,0(м². Общая площадь встроенных помещений составляет 9(0,52 м², гаража-стоянки – 1 494,05 м².

Конструктивная форма Жилого дома – монолитный железобетонный рамносвязевый каркас с наружными стенами из керамических блоков горизованных пустотелых с наружным утеплением из минераловатных плит.

Наружная отделка стен – покраска фасадными красками по декоративной штукатурке, акриловая штукатурка с имитацией кирпичной кладки.

Нормативный срок строительства Жилого дома составляет 2(месяцев, предполагаемая дата приемки в эксплуатацию Жилого дома – 10 декабря 2022 г.

Основаниями для проектирования и строительства Жилого дома являются:

- решение Мингорисполкома от 19 декабря 2019 г. № 4028С
- решение Мингорисполкома от 24 сентября 2020 г. № 3149С
- решение Мингорисполкома от 19 ноября 2020 г. № 3(40С
- решение Мингорисполкома от 31 декабря 2020 г. № 4201С
- свидетельство (удостоверение) № 500ф1(6-301 от 2(.10.2020 г. о государственной регистрации перехода права аренды на земельный участок, правообладатель – ЭмитентС
- свидетельство (удостоверение) № 500ф06-5512 от 14.12.2020 г. о государственной регистрации создания земельного участка на основании выделения вновь образованного земельного участка, возникновения права аренды на земельный участок, правообладатель – Эмитент.

10. Выпуск Облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов 5 июля 2021 г.

Государственный регистрационный номер: 5-200-02-4336.

11. Эмитент осуществляет эмиссию Облигаций в соответствии с подпунктом 1.(пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 2((«О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» (далее – Указ № 2(( ). Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям обеспечено поручительством.

Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям обеспечено поручительством Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» (далее – Поручитель) (юридический адрес: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 1(, 4-й этаж, офис 14, почтовый адрес: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 1(, 4-й этаж, УНП 101484246) в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 14.05.2021 г. № бф (далее – Договор).

Поручитель принимает на себя безусловное и безотзывное обязательство солидарно с Эмитентом исполнить обязательства перед владельцами Облигаций в объеме 2 1(5 000 (два миллиона сто семьдесят пять тысяч) белорусских рублей в случае неисполнения либо ненадлежащего исполнения данных обязательств Эмитентом.

12. Размещение Облигаций осуществляется путем проведения открытой продажи на неорганизованном рынке. Покупателями Облигаций могут быть юридические и (или) физические лица, резиденты и (или) нерезиденты Республики Беларусь (далее – Покупатели Облигаций).

Дата начала размещения Облигаций: **Н июня 2021 г.**

Дата окончания размещения Облигаций: **21 декабря 2023 г.,** если иная дата не будет определена Общим собранием участников Эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством о ценных бумагах. Срок открытой продажи Облигаций может быть сокращен также в случае полного размещения всего объема выпуска Облигаций.

Отношения сторон оформляются:

- договором с Эмитентом, заключенным в простой письменной форме, предусматривающим обязательства Эмитента по строительству жилого помещения в Жилом доме владельцу Облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством (далее – договор с Эмитентом)С
- договором купли-продажи (размещения) Облигаций, который имеют право заключать Покупатели Облигаций, заключившие договор с Эмитентом.

Для заключения договора с Эмитентом и договора купли-продажи (размещения) Облигаций Покупатели Облигаций должны обратиться к Эмитенту по адресу: **22004Ш г. Минск, ул. Кнорина, 1Н, 1-й этаж, офис 10Ш** в течение срока размещения Облигаций ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00.

Открытая продажа Облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой Эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи Облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг. При этом максимально допустимая цена размещения Облигации – **4 140 (четыре тысячи сто сорок) белорусских рублей.**

13. Срок обращения Облигаций – 935 календарных дней (с (июня 2021 г. по 29 декабря 2023 года).

14. Эмитент осуществляет досрочное погашение всего выпуска Облигаций или его части в случаях, установленных законодательством о ценных бумагах.

Эмитент также вправе принять решение о досрочном погашении Облигаций: выкупленных на условиях, указанных в Проспекте эмиссии жилищных облигаций шестого выпуска (далее – Проспект эмиссии)Св случае ввода Жилого дома в эксплуатацию ранее даты начала погашения Облигаций, указанной в пункте 15 настоящего документаСв случае проведения конвертации Облигаций до даты окончания срока обращения Облигаций.

15. Дата начала погашения Облигаций – 29 декабря 2023 г.

Правом на получение жилого помещения в Жилом доме либо номинальной стоимости Облигаций при погашении (досрочном погашении) Облигаций обладают лица, имеющие действующий договор с Эмитентом, исполнившие обязательства по договору с Эмитентом и указанные в реестре владельцев Облигаций, сформированном депозитарием Эмитента:

- для целей погашения Облигаций – на 22 декабря 2023 г.С
- для целей досрочного погашения Облигаций – за 5 рабочих дней до установленной Эмитентом даты досрочного погашения Облигаций.

16. Ознакомиться с Проспектом эмиссии можно ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 в месте продажи Облигаций, указанном в пункте 12 настоящего документа. Лицо, знакомящееся с Проспектом эмиссии, вправе читать и делать выписки из предоставленного документа.

Директор А.А. Сидоренко

Главный бухгалтер Т.В. Коробкина

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Продавец	ООО «МилкПакинг»С юридический адрес: 220099, г. Минск, ул. Казинца, д. 33, корп. 10, каб. 3 СУНП 192491(19
Организатор торгов	Ликвидатор ООО «МилкПакинг» – индивидуальный предприниматель Харкович Андрей Михайлович г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 34 тел. 8 (01( ) 236-50-24
Контактные данные	По вопросам, связанным с осмотром объекта продажи, обращаться по телефону 801(-236-50-24
Предмет торгов	**Лот № 1.** ЛИНИЯ ДЛЯ ПРОИЗВОДСТВА БАГЕТОВ W: . **Лот № 2.** ФРИТИРУЮЩАЯ ЛИНИЯ ДЛЯ ПРОИЗВОДСТВА БЕРЛИНЕРОВ TA4T SMI XO. **Лот № 3.** МЕТАЛЛИЗАТОР ВАКУУМНЫЙ GOXORA4 OXGOXOROOXG, 2009 г. в., обременение – залог
Начальная цена предмета торгов	**Лот № 1.** 12 144,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 2 024,00 бел. руб. **Лот № 2.** 9 024,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 1 504,00 бел. руб. **Лот № 3.** 265 652,40 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 44 2(5,40 бел. руб.
Сумма задатка	**Лот № 1.** 12,14 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов. **Лот № 2.** 9,02 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов. **Лот № 3.** 265,65 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов
Шаг аукциона	5 % от первоначальной цены
Открытый аукцион состоится	**21.0Н.2021 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 26б (комната переговоров)
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 8.30 до 1(.00 по 20.0(.2021 включительно по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 34

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 12,14 бел. руб. за Лот № 1, 9,02 бел. руб. за Лот № 2 и 265,65 бел. руб. за Лот № 3 на счет № BY(1 A4ЧA 3012 2(23 4400 302(0000 в ЗАО «АльфаБанк», БИК A4ЧABY2X, УНП 192491(19.

Заключительная регистрация участников аукциона – **21 июля 2021 года с Ш30 до ШЎЎ.** Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны подписать протокол о результатах аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету в течение 30 банковских дней с момента подписания договора купли-продажи.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Ссылки на ранее опубликованные извещения:
газета «Звязда» № ((293(6) от 15.01.2021С
